Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, ХАЛЕНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ЧАЦЬВЕР
18 чэрвеня 1931 г.
№ 137 (3226)

Гос. Ленина 21 Публ. библ-ка 12 янв. 2 г. Гос.

Тры чарговых зьвеньні

Закончыўся пленум ЦК УсеКП(б), які разгледзеў пытаньні аб выніках сяўбы і задачах уборачнай кампаніі, чыгуначным транспарце і яго чарговых задачах, аб Маскоўскай гарадзкой гаспадарцы і аб разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі СССР. Рэзалюцыя пленуму па ўсіх гэтых пытаньнях публікуецца ў сёньнішнім нумары «Правды»[1]).

Выканаўшы плян веснавой сяўбы к 10 чэрвеня на 90 проц., мы ўжо перавысілі дасягнені веснавы клін. Па бабоўне засеяна 159,7 проц. пасеўнай плошчы мінулага году; па цукровых бураках—129,8 проц.; па сланечніку—97,5 проц.; па гародніх культурах—107,9 проц.; нарэшце, па шпанцы—103,1 проц. Сяўба працягваецца. Такім вобразьным, як Заходняя, Усходняя Сібір, Далёкі Ўсход трэба выканаць яшчэ дзесяткі процантаў сваіх плянаў.

Перад партыяй і Савецкай уладай у ўсёй вострасьці становіцца задача сабраць ураджай. З 95 млн. га засеяных да 10 чэрвеня каля 63 млн. га, або звыш дзьве трэці прыпадае на багатыя сэктар. Зусім здавальняючыя вынікі пасеўнай кампаніі ў гэтым сэктары зьвязаны ня толькі з правільнай арганізацыяй працы, але і з шырокім ужываньнем машын у палявых работах. Між тым уборачныя работы у нас да гэтага часу мэханізаваны ў значна меншай ступені, чым пасеўныя. Праблема ўборкі ў буйной сельскай гаспадарцы (а наша сельская гаспадарка ўжо стала буйным сацыялістычным гаспадаркі) зьяўляецца значна больш трудной праблемай у параўнаньні з сяўбой.

Ужо ў мінулым годзе мы сустрэлі ся яе труднасьцямі і не змаглі іх адолець перамогчы. У гэтым годзе плошча ўборкі значна вырасьце. У саўгасах яна вырасьце прыкладна ў 3 разы. У калгасах мы маем асабліва вялікі ост пасеўнага кліну па тэхнічных культурах (буракі, бабоўна), дзе вялікарную частку ўборачных работ прыдзецца праводзіць ручным спосабам. Гэтае самае даводзіцца сказаць і аб гародных культурах. Толькі далейшая правільная арганізацыя працы, сапраўднае правядзеньне зьдзельшчыны ў калгасах, радыкальная ліквідацыя абязьлічкі, з абслугоўваньнем машын, мабілізацыя перавозачных сродкаў у саўгасах і пры баявой рабоце транспарта па дастаўцы ўборачных машын на месца забясьпечаць уборку ураджаю трэцяга году пяцігодкі, гоў рашаючых посьпехаў партыі ў праве рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, году набудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі нашае краіны.

Трэба адзначыць, што ў галіне арганізацыі сацыялістычнай жывёлагадоўлі мы недастаткова шпарка рухаемся наперад па лініі калгасаў. А адны саўгасы тут пытаньня ня вырашаць. Чытарка ідзе ня толькі пра мяса, малако і масла для шырокіх працоўных мас, а аб канчатковай ліквідацыі трудасьцяй харчаваньня і забясьпечаньня чытарка ідзе аб цягавай сіле, якая коўта яшчэ будзе адыгрываць ролю поруч з трактарам, адсюль уся важнасьць сена-ўборачнай кампаніі, уборкі зярновых і ў прыватнасьці сіласных культур.

—

[1]) Сёньня мы друкуем у нашай газэце рэзалюцыі па дакладу аб выніках сяўбы і задачах уборачнай кампаніі і, аб чыгуначным транспарце, статнія рэзалюцыі будуць зьмешчаны ў заўтрашнім нумары газ. «Сав. Беларусь».

Каб зразумець усю складанасьць уборачнай кампаніі трэба прыняць пад увагу, што ў значнай сваёй частцы яна супадае з асеньняй пасеўкампаніяй, ворывам на зіму, з разгортваньнем хлебазагатовак. Рэзалюцыя пленуму ЦК мабілізуе ўвагу ўсяе партыі на баявое, бальшавіцкае правядзеньне ўборачнай кампаніі, на перамогу ўсіх яе труднасьцяй, на перамогу супраціўленьня кулацтва, якое будзе ўжываць апошнія намогі для дэзарганізацыі ўборачных работ у калгасах, і асабліва ў аднаасобным сэктары. Уборачная кампанія павінна быць зьвязана з паўнейшым правядзеньнем сацыяльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, з перамаганьнем правага кірункіму і клевацкіх закокаў у практыцы партыйнай, савецкай работы і калгаснага будаўніцтва на вёсцы.

Пленум разгледзіў пытаньне аб чыгуначным транспарце і яго чарговых задачах. Пагоршаньнем работы чыгуначнага транспарту зімой сарвалася выкананьне прамфінпляну першага кварталу. Зараз мы грузім ужо звыш 50 тыс. вагонаў у дзень, але ўвосень нам давядзецца вазіць 55-60 тыс. вагонаў у сувязі з разгортваньнем прамысловасьці, з капітальным будаўніцтвам і хлебазагатоўкамі.

Грузазварот нашага транспарту ўжо амаль дасягнуў граніц, якія намячаліся для апошняга году пяцігодкі. Разгортваецца далей на сучаснай тэхнічнай базе, якая вельмі мала зьмянілася ў параўнаньні з даваеным часам, транспарт яўна ня можа. Адсюль праблема рэканструкцыі чыгуначнага транспарту, якам паўстала цяпер з усёй вострасьцю.

Пленум намеціў шырокую праграму рэканструкцыйных работ, відучым зьвяном якой зьяўляецца электрыфікацыя транспарту. Для выкананьня гэтай праграмы павінна мабілізавацца наша прамысловасьць, праграма рэканструкцыі транспарта ставіць асабліва вялікія патрабаваньні да чорнай і каляровай металюргіі. Яна лішні раз нагадвае ўсёй краіне і партыі, што ўсе адставаньні і недавыкананьні пляну, якія мы маем у рабоце мэталюргічных заводаў, нельга далей цярпець. Але поруч з баявой хуткай мабілізацыяй нашае прамысловасьці на выкананьне гэтай праграмы, для забясьпечэньня росту работы транспарту ў каранной рэканструкцыі неабходна зрабіць упор на ўнутраныя рэсурсы самога транспарту: перавесьці транспарт на гаспадарчы разьлік, паставіць на баявую ногу работу паравоза-рамонтных і вагона-рамонтных заводаў і дэпо, правесьці зьдзельшчыну, ліквідаваць ураўнілаўку і абязьлічку у арганізацыі і аплаце працы. Замацаваць увядзеньне спаранай язды, рашуча палепшыць работу ўсяго апарату руху, што зьяўляецца зараз найбольш адсталым вучасткам, палепшыць работу самога апарату НКШЗ, унёсшы туды больш апэрацыйнасьці, замацаваць яго сувязь з месцамі, цьвёрдай рукой ліквідаваць рэшткі шкодніцтва, элемэнты бюракратызму, апартунізму, самацёку.

Выключнае значэньне мае задача забясьпечэньня транспарту палам для ўзмоцненых асеньніх перавозак. Вырашэньне гэтай задачы ўпіраецца ў работу вугальнай прамысловасьці, патрабуе безадкладнай ліквідацыі адставаньня ад пляну здабычы вугалю і нашых асноўных вугальных раёнах. Асабліва ненармальныя ўмовы аплаты працы, сапраўдная вакханалія ўраўнілаўкі і абязьлічкі на транспарце да самага нядаўнага часу адставаньне транспарту ад прамысловасьці на лініі разьвіцьця, ударніцтва і сапыялістычнага спаборніцтва, вялізарная ўсе бакавасьць розных зьвеньняў транспарту клясава-варожым і чужым элемэнтам, больш шырокае разьвіцьцё шкодніцтва чым дзе-б та ні было, маглі мець месца пры слабой рабоце прафэсыянальных арганізацый, у якой ня гледзячы на вядомае палепшаньне за апошні час, застаецца яшчэ шмат элемэнтаў хвасьцізму і самацёку. Трэба рашучае далейшае палепшаньне работы партыйных і асабліва прафэсыянальных арганізацый на транспарце, больш увагі транспарту з боку партыі.

Пленум прыняў важнейшае рашэньне аб Маскоўскай гарадзкой гаспадарцы і аб разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі ў СССР.

Адставаньне гарадзкой гаспадаркі яна тармозіць далейшы рост прамысловасьці і палепшаньне становішча рабочае клясы, задавальненьне яе жыцьця растучых матар'яльных і культурных патрэб. Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР непарыўна зьвязаны з палепшаньнем становішча рабочых.

XVI зьезд год таму назад вынес рашэньне аб тым, каб на аснове росту цяжкай індустрыі паскорыць разьвіцьцё лёгкай прамысловасьці, выробляючай прадметы спажываньня. Мінулы сьнежаньскі пленум ЦК намеціў рад мерапрыемстваў па палепшаньні работы рабочага забесьпячэньня і работы каапэрацыі. Тольки што закончыўшыся чэрвеньскі пленум у сваім рашэньні аб гарадзкой гаспадарцы паставіў перад усёй партыяй ва ўсёй палітычнай вострасьці пытаньні рабочага жылёвага будаўніцтва, гарадзкога дабра быту, мясцовага транспарту, хлебазабесьпячэньня, электрыфікацыі, санітарнага становішча гарадоў, пытаньне будаўніцтва новых гарадоў на базе далейшага росту прамысловасьці і сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі.

Партыя павінна навучыцца тварам да гэтай вялізарнай праблемы, якая самым цесным чынам зьвязана з абслугоўваньнем матар'яльных і культурных патрэб рабочае клясы, рашуча рушыць ўперад тэмпы росту гарадзкой гаспадаркі выраўнёваючы тым самым фронт сацыялістычнага наступленьня, робячы тым самым важнейшы крок поўнай пабудовы сацыялізму ў нашай краіне, у той час, калі ва ўсім капіталістычным сьвеце расьце і разьвіваецца эканамічны крызіс.

Наша сацыялістычнае наступленьне працягваецца. Партыя бярэ адну пазіцыю за другой, усё далей і далей адрываючы клясавага ворага. Ленінская генэральная лінія перамагае ў рашучай бальшавіцкай барацьбе на ўсе фронты. Клясавы вораг яшчэ супраціўляецца. Нападаючыя над яго ўцільі элемэнты ўнутры партыі ўсё яшчэ далёка ня склалі сваёй зброі яны не заўсёды выступаюць адкрыта. XVI зьезд адзначыў ужо, што апартуністычныя элемэнты ўнутры партыі таксама прыкрываюцца яе генэральнай лініяй, іншы раз яны проста маўчаць чакаючы больш спрыяючага моманту. Адсутнасьць адкрытай афармленай апазіцыі не дамабілізуе сілы нашае партыі ў барацьбе супроць усіх відаў правага і «левага» апартунізму. Гэтай барацьбой былі і будуць зьвязаны посьпехі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, з ёй будзе зьвязана ажыцьцяўленьне і тых вялізарных канкрэтных гаспадарчых задач, якія партыя паставіла перад сабой на толькі што скончыўшымся пленуме ЦК.

«Правда».

Папярэднія вынікі сяўбы і задачы ўборачнай кампаніі

Рэзалюцыя па дакладу тав. Якаўлева і садакладу тав. Крыніцкага, прынятая пленумам ЦК УсеКП(б) 12-га чэрвеня 1931 году

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

11-15 чэрвеня 1931 году адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б). Пленум разгледзе наступныя пытаньні:

1. Папярэдні вынікі сяўбы і задачы ўборачнай кампаніі.

2. Чыгуначны транспарт і яго чарговыя задачы.

3. Аб маскоўскай гарадзкой гаспадарцы і аб разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі СССР.

Па ўсіх пытаньнях ухвалены адпаведныя рэзалюцыі.

1. У выніку вясны 1931 году калектыўны рух атрымаў рашаючыя перамогі ў большасьці раёнаў і абласьцей па асноўных галінах сельскае гаспадаркі СССР.

а) Завершана калектывізацыя ў асноўных зярновых раёнах (Украінскі стэп, Паўночны Каўказ, Нижняя Волга, Заволжжа, Сярэдняя Волга, Крымская стэп), дзе калектывамі аб'яднана больш 80 проц. агульнага ліку гаспадарак і больш 90 проц. усяго сялянскага пасеву і сродкі сельска-гаспадарчай вытворчасьці;

б) У астатніх зярнёвых раёнах (ЦЧО, Лесьвстэп Украіны, Правабярэжжа Сярэдняй Волгі, зярнёвыя раёны Казакстану, Заходняя Сібір, Урал, Башкірыя, ЦВО) і рашаючых бананавых і бураковых раёнах (бананавыя раёны Узбэкістану, Казакстану, Туркмэністану і Азэрбайджану, бураковыя раёны ЦЧО і Украіны) калектывамі аб'яднана больш 50 проц. гаспадарак і звыш 60 проц. сялянскіх пасеваў, што дае магчымасьць у асноўным завершыць тут суцэльную калектывізацыю ў гэтым годзе і, ва ўсякім выпадку, не пазьней вясны 1932 году. Усё гэта азначае, што тэмпы калектывізацыі, намечаныя рашэньнем Цэнтральнага камітэту партыі ад 5-I-1930 г., рашэньні XVI зьезду партыі і VI зьезду саветаў ужо перавышаны;

в) Сяўба 1931 г. дала новыя ўзоры высокай ураджайнасьці аб'яднанай калектыўнай гаспадаркі: пасеў у адну пяцідзёўку ў СССР (9-10 мільёнаў га) значна перавысіў пасеў у адну пяцідзёўку ў мінулага году (6 млн. га); машынатрактарныя станцыі запрацоўвалі звыш трэцяй часткі калгасных пасеваў (звыш 20 млн. га); пасеў на калгаснага ніва амаль у 3 разы перавысіў на адзінага каня аднаасобніка; пасеў на двор у калгасе ў 2-3 разы перавысіў пасеў на двор аднаасобніка; якасьць апрацоўкі зямлі ў калгасе палепшылася.

З гэтага выходзіць, што калгаснае сялянства ўжо пераварылася ў цэнтральную фігуру земляробства, калгасы зрабіліся асноўным вытворцай ня толькі ў галіне зерня, але і важнейшай сельска-гаспадарчай сыравіны (бавоўна, буракі, сланечнік і г. д.). Роля бадзяка і серадняка—аднаасобніка ў с.-г. вытворчасьці зрабілася другарадная. Завяршаецца ліквідацыя кулацтва, як класы, у зярнёвых і сыравых раёнах СССР.

2. Пасеўная плошча саўгасаў вырасла ў параўнаньні з 1930 годам больш чым у 2 разы: Зернётрэст, жывёлагадоўчыя трэсты і саўгасы тэхнічных культур, засеяўшы ўвесну 1931 году больш 8 млн. га, замест 3,2 млн. вясны 1930 г., перавыканалі заданьне VI зьезду саветаў. На большасьці раёнаў саўгасы закончылі пасеў на 2-3 тыдні раней калгасаў.

3. У выніку разьвіцьця саўгасаў і пераходу большасьці працоўнага сялянства на шлях калектывізацыі, наша, краіна зрабілася краінай самай буйной сельскай гаспадаркі ў сьвеце: усяго ў 1931 году 200 тыс. калектыўных гаспадарак, якія аб'ядналі 13 млн. былых аднаасобных гаспадарак, засеялі разам з 4 тысячамі саўгасаў больш ¾ яравой пасеўнай плошчы, у той час як астатнія 12 млн. аднаасобных гаспадарак аказаліся ў стане засеяць толькі каля ¼ яравой пасеўнай плошчы.

II. Аднак, вопыт мінулага году паказвае, што заспакойвацца на посьпехах калектывізацыі і пасеўкампаніі і не дзацэньваць усю сур'ёзнасьць задач у галіне ўмацаньня калгасаў і ўборкі ўраджаю — значыла б нанесьці вялізарную шкоду справе калектывізацыі. Разьмеркаваньне даходаў не на працы, якое шырока практыкавалася ў мінулым годзе, а ў душах, побач з недахопам вопыту ўдзельня буйнай гаспадаркі, прывяло да таго, што ў многіх выпадках уборка ня была даведзена да канца, страты ў калгасах пры ўборцы аказаліся вельмі вялікімі, а плошча зяблевага ворыва была пашырана зусім недастаткова. У саўгасах гэткую-ж адмоўную ролю адыграла дрэнная сакрыстаньне машын, абязьлічка, недастатковая кіруючымі кадрамі саўгасаў труднасьцяй зьвязаных з уборкай, забываньне абавязкаў саўгасаў, як вытворцаў таварнай прадукцыі ня толькі засеяць, але і здаць дзяржаве сваю прадукцыю ва ўстаноўленыя тэрміны і ва ўстаноўленых разьмерах. У мэтах зьнішчэньня гэтых недахопаў, пленум Цэнтральнага камітэту прапануе партыйным арганізацыям забясьпечыць ажыцьцяўленьне ў сувязі з уборачнай кампаніяй наступных мерапрыемстваў.

1. Усе без выключэньня работы ў калгасах павінны быць арганізаваны на асновах зьдзельшчыны з тым, каб самыя формы зьдзельшчыны былі найбольш простымі і зразумелымі кожнаму калгасьніку і колькасьць працадзён, якая прылічваецца калгасьніку, магла быць запісана ў яго працоўную кніжку без складаных разьлікаў, з вучотам пры гэтым ня толькі колькасьці зробленай работы, але яе і якасьці. Саўгасы ў галіне ўжываньня зьдзельшчыны павінны служыць такім-жа прыкладам для калгасаў, якім яны зьяўляюцца ў галіне арганізацыі вытворчасьці і прыстасаваньня машын.

2. На ўсіх відах работ павінна быць ўжыта прымацаваньне сталага складу работнікаў да трактароў, коняй і машын: да кожнай малатарні, да кожнага трактара з адгаведнымі прычэпнымі машынамі павінна быць прымацавана сталая брыгада, павінен быць створаны сталы склад возчыкаў і г. д. У вялікіх калгасах, а таксама ў саўгасах з вялікім клінам прапашкі і тэхнічных культур брыгады павінны быць прымацаваны да пэўных вучасткаў уборачнай плошчы з тым, каб у залежнасьці ад разьмераў пасеваў пры ўборцы і хуткасьці ўборкі, ацэнка работы брыгады ў працаддзён павялічвалася або зьнижалася.

3. Побач з своячасовым выкананьнем прадугледжаных дагаворамі калгасаў і вытворчымі плянамі саўгасаў абавязацельстваў па здачы прадукцыі, партыйным арганізацыі і зямельным органы павінны забясьпечыць улетку і ўвосень 1931 г. узорванае 15 млн. га пад азімы пасеў 43 млн. га азімины, у тым ліку ня менш 15 млн. га яшанцы, а таксама ўзорванае на зяб 42 млн. га, у тым ліку 9 млн. саўгасамі і 31 млн. калгасамі. Ажыцьцяўленьне гэтага заданьня патрабуе правільнага разьмеркаваньня паміж усімі пасобнымі работамі людзей, трактароў, коняй і машын, і забясьпечаньня максымальнай іх продукцыйнасьці, што павінна быць прадугледжана ў рабочым пляне кожнага саўгасу і калгасу. Не павінна быць ніводнага калгасу, а тым больш саўгасу, без такога пляну асеньніх работ.

4. Зьдзельшчына неажыцьцёўна без своячасовага вучоту колькасьці выпрацаваных кожным калгасьнікам працадзён. Больш таго, бяз вучоту—немагчыма існаваньне калгасу, як буйнай гаспадаркі. У справе арганізацыі вучоту ў калгасах партыйныя арганізацыі павінны кіравацца ўказаньнямі Леніна: «Вучот і кантроль за колькасьцю працы і за разьмеркаваньнем прадуктаў, гэта сутнасьць сацыялістычнага пераўтварэньня, калі палітычнае панаваньне пралетарыяту створана і забясьпечана...» «Сацыялізм — гэта вучот перш за ўсё». Пленум прапануе партыйным і савецкім арганізацыям забясьпечыць ва ўсіх без выключэньня калгасах да пачатку ўборкі скаканьне вучоту працадзён ,выпрацаваных кожным калгасьнікам ў часе пасеўнай і праполачнай кампаніі.

5. Для забясьпечаньня пасьпяховага правядзеньня ўборкі асаблівая ўвага партыйнымі арганізацыямі павінна быць зьвернута на правільнае і своячасовае разьмеркаваньне даходу паміж калгасьнікамі.

Пленум цэнтральнага камітэту прапануе партыйным арганізацыям ажыцьцёвіць у калгасах наступныя правілы разьмеркаваньня даходаў:

а) разьмеркаваньне даходаў у калгасах павінна быць закончана не пазьней 15—20 студзеня;

б) кожны калгас пры зацьвярджаньні пляну разьмеркаваньня даходаў адкладае сродкі, неабходныя для ажыцьцяўленьня намечаных ім капітальных затрат (недзялімы фонд), у разьмерах ад 10 проц. у новых калгасах да 15 проц. у старых;

в) выдача на рукі калгасьнікам натуральнай часткі даходу, які ім прылічваецца, праводзіцца ва ўстаноўленыя калгасамі тэрміны;

г) пры разьмеркаваньні кармавых рэсурсаў у першую чаргу павінна быць забясьпечана арганізаваная частка прадуктовай жывёлы, (асабліва калгасныя таварныя фэрмы) і рабочай жывёлы, а астатняе разьмяркоўваецца паміж калгасьнікамі па колькасьці выробленых калгасьнікамі працадзён і з вучотам наяўнасьці ў іх прадуктовай жывёлы;

д) насенныя фонды вылучаюцца калгасамі ў разьмерах, забясьпечваючых пашыраныя пасеўныя плошчы, прадугледжаных плянам, прычым асобай пастановай праўленьня калгасу павінен быць устаноўлены парадак адбору і хаваньня насеннага фонду, гарантуючы найлепшую яго якасьць;

е) па рашэньні большасьці калгасьнікаў, азімыя пасевы новых членаў калгасу арамаджваюцца і ўборка іх праводзіцца калектыўна;

ж) устаноўленае 5 проц. адлічэньне ад даходу калгасу ў рабах суцэльнай калектывізацыі рэкамандуецца скарыстаць наступным чынам: 2 проц. разьмяркоўваецца ў адгаведнасьці з разьмерамі арамаджанай калгасьнікамі маёмасьці, паўтара процанта ў фонд дапамогі калгасьнікам, якія паву нацца на розных курсах.

Пленум цэнтральнага камітэту асоба адзначае адказныя задачы, якія стаяць перад машынатрактарнымі станцыямі, як арганізатарам ня толькі тэхнічнай базы, але і ўсёй гаспадаркі калгасаў. Улетку і ўвосень гэтага году машынатрактарныя станцыі павінны ўзарваць 5 мільёнаў га папара, пасеяць 8 мільёнаў га, азімых, узьняць 15 мільёнаў га зябу і разам з тым правесьці здачу (продаж) дзяржаве таварнай прадукцыі аб'яднаных імі калгасаў ня толькі ў галіне зерня, але і ў галіне тэхнічных культур.

База таварнай прадукцыі калгасаў робіцца непасрэдна вытворчай задачай машынатрактарных станцый. Машынатрактарныя станцыі, праз якія рабочая кляса Савецкага Саюзу вядзе справу тэхнічнага пераўзбраеньня калгаснага сялянства, павінны выканаць стаячыя перад імі задачы ўборкі і здачы зерня і тэхнічных культур з ня меншым посьпехам, чымся, яны выканалі перавыканалі пасеўныя заданьні.

7. Пленум цэнтральнага камітэту зьвяртае ўвагу арганізацыі на тое, што ўборка 4.500.000 га зернясаўгасамі і здача імі ня менш 160 мільёнаў пудоў таварнай прадукцыі зьяўляюцца адной з важнейшых гаспадарча - палітычных задач уборачнай кампаніі. Зернятрэст і зернясаўгасы павінны ў бягучым годзе забясьпечыць ня толькі своячасовую ўборку пасеўнага, але і своячасовую здачу таварнага зерня.

8. Ня менш важныя задачы стаяць і перад жывёлагадоўчымі саўгасамі. Яны згодна вытворчага пляну, у гэтым годзе павінны ўбраць каля 350 мільёнаў пудоў сена, 100 млн. пудоў, сакавітых кармоў і 35 мільёнаў пудоў зернафуражу.

Уборачная кампанія ў жывёлагадоўчых саўгасах затрудненна слабасьцю мэханізацыі і неабходнасьці з прычыны гэтага пераважную частку ўборачных работ праводзіць пры дапамозе коняй і валоў. Гэта абавязвае жывёлагадоўчыя саўгасы, побач з усямерным укараненьнем мэханізацыі, зьвярнуць асобную ўвагу на забесьпячэньне сябе жывой цягавай сілай (коні, валы, вярблюды). ЦК прапануе партыйным арганізацыям аказаць дапамогу саўгасам па вярбоўцы цягавай і рабочай сілы, а таксама мясцовага транспарту, для перавозкі кармоў; ЦК ускладае на райкомы і РВК адказнасьць за арганізацыю гэтага садзейнічаньня.

9. У галіне ўборкі тэхнічных культур у мінулым годзе асабліва вялікія былі страты, выкліканыя дрэннай арганізацыяй ўборачнай кампаніі пры поўнай адсутнасьці мэханізацыі ўборкі. Пры значным росьце таварнай прадукцыі на ўсіх тэхнічных культурах будзе толькі незначная мэханізацыя ўборкі і первічнай перапрацоўкі, асноўная частка работы будзе ў гэтым годзе праводзіцца ўручную і конным інвэнтаром. У адпаведнасьці з гэтым пленум цэнтральнага камітэту зьвяртае ўвагу партыйных арганізацый, зямельных арганізацый і калгасаў на неабходнасьць:

а) прадуманай арганізацыі ўсёй уборачнай кампаніі на аснове ўдзелу ўсяго калгаснага насельніцтва на ўборцы і пры самым строгім зжыцьцяўленьні зьдзельшчыны;

б) скарыстаньне, асабліва ў адносінах лёну і канапель, побач з заводамі па первічнай перапрацоўцы, прасьцейшых спосабаў палегчаньня працы калгасьніка;

в) правядзеньне ўборкі і здачы пра-

На рыштаваньня... ...оўлі

дукцыі ў тэрміны і разьмерах прадугледжаных кантрактацыйнымі дагаворамі;

г) пералогу поўнасьцю і ў тэрміны, прадугледжаныя загаротам ЦК і СНК аб кантрактацыі, колькасьці хлеба, прамтаварараў, жмыхоў, масла. ЦК адзначае задачу арганізацыі ўборкі і здачы саўгасамі «Саюзсахараў» 200 мільёнаў пудоў буракоў і ня менш 30 мільёнаў пудоў таварнага хлеба «Саюзхлеб» і прапануе ЦК КП(б)У і ЦЧО ўзяць у гэтай справе саўгасам неабходную дапамогу.

10) ЦК прапануе партыйным і савецким арганізацыям забясьпечыць ня раўнцтва правядзеньнем ўборачнай кампаніі ў аднаасобных гаспадарках, зьвязаючы гэтую работу з дальшым разьвіцьцём калектывізацыі. ЦК зьвяртае ўвагу партарганізацый на тое, што ўвесну ў выніку недастатковай работы сярод аднаасобнікаў у радзе раёнаў праходзіць адставаньне аднаасобнікаў у сяўбе асабліва па лёну, каноплях, тытуню.

11. Пасьпяховае і найбольш эфэктыўнае правядзеньне саўгасамі і машынатрактарнымі станцыямі ўборачнай кампаніі патрабуе своячасовага выкананьня прамысловасьцю зацьвярджанага пляну вырабу ўборачных машын. З прычыны гэтага ВСНГ павінна забясьпечыць на працягу чэрвеня і ліпеня месяцаў заводам сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва, выкананьне праграмы па здачы машын і за папярэднія месяцы.

Пленум цэнтральнага камітэту асабліва зьвяртае ўвагу рабочых, адміністрацыйна-гаспадарчага і інжынэрна-тэхнічнага персаналу заводу «Камунар» (камбайны), Любарэцкага (сонакасілкі і лёнацерабілкі), Клімаўоскага, Арлоўскага і заводу імя Карла Маркса (абстаўляньне заводаў первічнай перапрацоўкі лёну і канапель), Растоўскага сельмашу (снопавязалкі, сенаўборачны інвэнтар), Чэрнаскага і Першамайскага (бавоўна-ўборачныя машыны), Нікалаеўскага (бурака-ўборачныя машыны і плугі), Гомельскага сельмашу (сіласарэзкі), Рязанскага (бульбакапалкі), «Серп і Молат» (малатарні), на тое, што здача ўборачных машын у тэрмін зьяўляецца базавым заданьнем партыі. Разам із тым пленум ЦК прапануе ВСНГ скончыць вызначэньне вытворчай праграмы заводаў сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва на 1932 год не пазьней сярэдзіны ліпеня 1931 г., выходзячы з неабходнасьці забясьпечыць у буду чым годзе, побач з далейшай мэханізацыяй ўборкі і апрацоўкі зярнёвых культур, мэханізацыю ўборкі на менш 50 проц. бавоўны, лёну і бурэчкі а таксама поўнасьцю мэханізаваць вытворчасьці і апрацоўкі кармоў у жывёлагадоўчых саўгасах.

ЧЫГУНАЧНЫ ТРАНСПАРТ і ЯГО ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ

1. Рэзалюцыя па дакладу тав. Рухімовіча і садакладу тав. Андрэева, прынятая пленумам ЦК УсеКП(б) 15-га чэрвеня 1931 году

1. Пасьпяховае ажыцьцяўленьне індустрыялізацыі краіны, шпаркае разьвіцьцё ўсіх галін прамысловасьці, буйнейшых новых заводаў-гігантаў, магутных камбінатаў, узрастаючы ўздым сельскае гаспадаркі на базе яе калектывізацыі, будаўніцтва саўгасаў, бурное разьвіцьцё новых раёнаў з багацейшымі месцараджэньнямі, шырокае цягненьне ўсёй краіны ў гаспадарчае жыцьцё, вызначаюць вялізарны рост работы чыгуначнага транспарту, які зьяўляецца непарыўнай арганічнай часткаю сацыялістычнай індустрыялізацыі. За першыя два гады пяцігодкі грузазварот чыгунак СССР вырас з 156 млн. тон у 1929 годзе да 238 млн. тон у 1930 годзе супроць 132 млн. тон у 1913 годзе, перавысіўшы, такім чынам, даваенны ўзровень на 80 проц. Адначасова бурна растуць і пасажырскія перавозкі. У мінулым 1930 годзе чыгуначным транспартам неравезена 57 млн. чалавек, супроць 291 млн. у 1928 г. і 185 млн. чалавек у 1913 годзе. Па выкананьні грузавой работы чыгуначны транспарт СССР звяў другое месца ў сьвеце пасьля ПАЗШ. У 1930 годзе чыгункі СССР выканалі 133 млрд. тона - кілёмэтраў супроць 61 млрд. тона-кілёмэтраў у Нямеччыне, 29,2 млрд. тона-кілёмэтраў Англіі і 65 млрд. тона-кілёмэтраў у ПАЗШ. Такі рост перавозак пры параўнальна нязначным новым чыгуначным будаўніцтве прывёў да вялікага ўзмацненьня грузанапружанасьці чыгунак. Ужо ў мінулым 1930 г. грузанапружанасьць чыгунак СССР дасягнула 738.000 тона-кілёмэтраў на адзін кілёмэтр супроць 1.608.00 тона-кілёмэтраў у 1 клм. у сярэднім па сетцы ПАЗШ. В выніку агульная работа чыгуначнага транспарту СССР (перакозка грузаў і пасажыраў) дасягнула ў 1930 г. 185 млрд. перавезеных тона-кілёмэтраў у 2 разы вышэй узроўню перавозак 1913 г. і толькі на 7проц.ніжэй заданьня пяцігадовага пляну на 1932-33 г., устаўленага ў 198 млрд. перавозных тона-кілёмэтраў. У той час, калі пагыбельнае сусьветнага крызісу ў 1931 г. працягвае зьнижаць работу чыгуначнага транспарту ў капіталістычных краінах, перавозкі чыгунак СССР паказваюць далейшы значны рост і на сёньні работы ўжо ў 1931 г. пяцігодкі будзе выканана.

2. Паказаны рост работы чыгуначнага транспарту заснаваны як на павялічэньні яго матэрыяльна-тэхнічнай базы, так асабліва на палепшаньні скарыстаньня рэсурсаў чыгуначнага транспарту. Агульная цягавая магутнасьць паравознага парку краіны ўзрасла з 1913 г. па 1930 г. на 30 проц. пры росьце сярэдняй цягавай сілы паравоза з 8,4 тоны ў 1913 г. да 11 тон у 1930 г. Агульная грузападъёмнасьць вагоннага парку павялічылася таксама на 30 проц. Значна павялічана прапускная здольнасьць чыгунак за кошт адкрытых новых і пашырэньня станцый і вузлоў. За перыяд існаваньня савецкай улады пабудавана і здадзена ў эксплёатацыю на 1930 г. 12,8 тысяч кілёмэтраў новых дарог.

3. Гэта павялічэньне матэрыяльнай базы спраўджалася значным ростам якасных паказьнікаў работы транспарту. Сярэдне-сутачны прабег таварнага вагона ў 1930 годзе складаў 93,4 кілёмэтры супроць 72 клм. у 1913 г.; прабег таварнага паравоза—153 клм. у 1930 г. супроць 119 клм. у 1913 годзе. Перамагаючы супраціўленьне бюракратычна-коснага старога апарату чыгуначнага транспарту, видучы барацьбу са шкоднікамі, выдучаючы з свайго асяродзьдзя новыя кадры кіраўнікоў, чыгуначны пралетарыят, ня гледзячы на зруйнавальныя вынікі сусьветнай вайны і інтэрвэнцыі, дабіўся значных посьпехаў, пацьвердзіўшы вялізарную перавагу плянава-сацыялістычнай гаспадаркі перад капіталістычнай. Аднак, ня гледзячы на бязумоўныя посьпехі ў рабоце чыгуначнага транспарту, тэм ня росту яго не адпавядаюць тэмпам разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, у выніку чаго транспарт зьяўляецца вузкім месцам ў народнай гаспадарцы. Адсталасьць у тэхнічным пераўзброеньні чыгуначнага транспарту, значная зношанасьць яго асноўнага капіталу, шкодніцтва, якое прынядо вялікія разьмеры за папярэднія гады, з аднаго боку, буйныя арганізацыйныя недахопы сыстэмы кіраваньня транспартам і, галоўным чынам, праведзеная пры адсутнасьці адпаведнай тэхнічнай базы сыстэма абязьлічнай язды і укараненьне абязьлічкі ў іншыя зьвеньні транспартнай гаспадаркі, з другога—прывялі да пагоршаньня становішча перавознага парку, да рэзкага падзеньня працоўнай дысцыпліны, зьнижэньня прадукцыйнасьці працы і значнага пагоршаньня работы транспарту ў другой палове 1930 г. і ў першым квартале 1931 г.

4. Цэнтральны камітэт партыі ў час мабілізаваў увагу ўсёй партыі вакол пытаньняў аб транспарце і намеціў кардынальныя мерапрыемствы на аздараўленьні чыгуначнай гаспадаркі.

Праведзеная на падставе звароту ЦК партыі і СНК ліквідацыя абязьлічанай язды і замена яе спаранай, рэарганізацыя кіраваньня чыгуначным транспартам, зварочваньне на транспарт кваліфікаваных кадраў, падвышэньне зарплаты работнікаў рашаючых зьвеньняў чыгуначнай гаспадаркі ўжо далі свае вынікі. Ажыцьцяўленьне гэтай важнейшай дырэктывы партыі ўжо ў красавіку прывяло ня толькі да палепшаньня становішча паравознага парку, але і да значнага аздараўленьня ў чыгуначнай гаспадарцы.

5. Ня гледзячы на пералом у справе аздараўленьня чыгуначнай гаспадаркі тэмпы замацаваньня асноўных фактараў гэтага пералому трэба прызнаць недастатковымі. Рамонт рухомага складу і тэхнічнага парку ў большасьці сваёй усё яшчэ нездавальняючы. Прымацаваньне брыгад да паравозаў недастаткова трывалае, маюць месца частыя зрывы прымацаваных брыгад. Да крайнасьці нездавальняюча пастаўлена рэгуляваньне руху НК Шляхоў зносін дарогамі: дрэнная работа дыспэтчэрскага апарату, невыкананьне заданьняў вымяральнікаў і графікаў руху, значная колькасьць «здарэньняў» і дрэнная работа станцый, доўгія прастоі вагонаў, частая адмена цягнікоў—усё гэта зьнижае

ЧЫГУНАЧНЫ ТРАНСПАРТ І ЯГО ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ

1. Рэзалюцыя па дакладу тав. Рухімовіча і садакладу т. Андрэева, прынятая пленумам ЦК УсеКП(б) 15-VI—31 г.

васьць падрыхтоўкі кадраў для іх і г. д.), што прыводзіць да амярцвення капітальных укладанняў, зацяжкі будаўніцтва і ўздаражэння яго сабекошту. Побач з неабходнасцю рашучага павялічэння матар'яльнага накрыцця чыгуначнага транспарту, пленум прапануе НК Шляхаў зносін:

1. Дабіцца сапраўднага пералому ў справе палепшання арганізацыі капітальных работ на транспарце, мэханізацыі працэсаў будаўніцтва, лепшай арганізацыі працы, пашырэння падрыхтоўкі кадраў і палепшання кіраўніцтва ў нізавых будаўнічых зьвенях.

2. Максымальна пашырыць дапамож на-гаспадарчыя прадпрыемствы па выкарыстоўванні мясцовых сыравінных рэсурсаў.

Камісіі ВСНГ СССР не пазьней 15-VII распрацаваць плян вырабу неабходных мэханізмаў для новага чыгуначнага будаўніцтва (эскаватараў, вадаадлічных труб дамброўскага, сваябойнага абсталяваньня, камнядрабілак і г. д.).

Прапанаваць ВСНГ СССР у 3-месячны тэрмін устанавіць цьвёрды сьпіс новых чыгуначных ліній, якія падлягаюць абавязковай пабудове ў 1932 г.

III. Асеньня-зімовыя перавозкі

Адзначаючы зусім нездавальняючае разгортваньне работ па належнай падрыхтоўцы чыгуначнага транспарту да асеньня-зімовых перавозак (да разьвіцьця станцый, узлоў, разьездаў, зьмян шэньне профілю, узмацненьне і рамонт шляхаў; вадазабясьпечаньне, недастаўка рэйкаў, шпал і рухомага складу, зруб і абсталяваньне для вада забясьпечэньня і г д.), пленум ЦК лічыць па[illegible]хтоўку да асеньня-зімовых перавозак на аснове рашучага замацаваньня спаранай язды важнейшай задачай гаспадарчых, партыйных і прафэсыянальных арганізацый. Пленум ЦК прапануе:

Па цягавай гаспадарцы:

а) цалкам забясьпечыць ажыцьцяўленьне пляну аздараўленьня рамонту паравозаў і вагонаў і рашучага зьнішэньня колькасьці хворых паравозаў, устанавіць сыстэматычную праверку выкананьня гэтага пляну; б) забясьпечыць чоткую работу ў дэпо—гэтага асноўнага вытворчага зьвяна чыгуначнага транспарту, як у частцы якасна лепшай арганізацыі рамонту, так і ў справе падвышэньня прадукцыйнасьці працы і найбольш рацыянальнага скарыстаньня паравозаў; в) забясьпечыць сваячасовую пабудову і разьвіцьцё асноўных і зваротных дэпо, падвысіць якасьць рамонту, палепшыўшы адначасова дагляд за паравозам з боку паравозных брыгад. Забясьпечыць пры вядзеньне ў парадак існуючых у дэпо з пункту гледжаньня палепшаньня іх арганізацыі, становішча абсталяваньня апалу, асьвятленьня і г. д.); г) Узмацніць рамонтныя сродкі ў асноўных дэпо па на галоўных магістралях (дарогі Донбасу, Урал-Кузьнецкага камбінату Сібіры і інш.), забясьпечыўшы іх неабходнай рабочай сілай, інжынэрна-тэхнічнымі кадрамі; д) Адзначаючы нездавальняючае кіраўніцтва з боку НК Шляхаў зносін і дырэкцыі шляхаў на скарыстаньні чужаземнага вопыту і тэхнікі, а таксама амаль поўную адсутнасьць ужываньня іх у справе эксплёатацыі, арганізацыі складзкай гаспадаркі і рамонту рухомага складу НКПС, у бліжэйшы час забясьпечыць належнае скарыстаньне перадавой тэхнікі.

А. Прыняць рашучыя меры да ліквідацыі спазьненьняў пасажырскіх цягнікоў і сьледваньню таварных цягнікоў па расьпісаньні.

Б. Забясьпечыць падвышэньне кваліфікацыі і палепшаньне падбору дыспэтчарскага апарату і работнікаў станцый.

Абавязаць НКПС правесьці прымацаваньне складальных брыгад да паркаў зьмен, дыспэтчэрам і накіраваньням і г. д.

Г. На працягу летняга часу ажыцьцявіць неабходныя рацыяналізатарскія мерапрыемствы па палепшаньні работы сартовачных, распарадчых і прамяжутачных станцый.

Д. Скончыць да асеньня - зімовых перавозак работы па ўзмацненьні дыспэтчэрскай і агульнай сувязі для абслугоўваньня кіраўніцтва рухам цягнікоў і работай станцый, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на поўную забясьпечанасьць сувязьзю раёнаў з вялікай грузавой работай (Донбас, Урал, Сібір і інш.).

Е. Забясьпечыць належачае разгортваньне работы па мэханізацыі пагрузкі і выгрузкі, ажыцьцяўляючы яе ў першую чаргу ў буйнейшых вузлах і на распарадчых станцыях дарог Донбасу, Уралу, Маскоўскім і Ленінградскім вузлах.

Ж. Лічачы ненармальным існуючае становішча, пры якім паравозы і вагоны знаходзяцца ў рабоце ў сярэднім усяго каля 30 проц. прадукцыйнага рабочага дню, абавязаць НКПС ажыцьцявіць рад мерапрыемстваў па ўкараненьні рацыянальных графікаў абароту паравозаў, зьніжэньне прастояў паравозаў пад наборам вады, апалу у рамонце, зьніжэньне прастою вагонаў на станцыях, пад пагрузкай, выгрузкай і г. д.

ПА ЎЗМАЦНЕНЬНІ ПРАПУСКНОЙ ЗДОЛЬНАСЬЦІ.

НКПС забясьпечыць выкананьне работ па ўзмацненьні прапускной здольнасьці ў адпаведнасьці з рашэньнем ЦК ад 25-V—31 г. і ў тэрміны, устаноўленыя ўрадам, прыняўшы меры да фарсаваньня работ па найбольш загружаных напрамках, па пракладцы другіх шляхоў, устройству разьездаў, пашырэньню прапускной здольнасьці станцый, вузлоў, пабудове цягавых установак і г. д. з тым, каб гэтыя работы былі закончаны не пазьней 1-X—1931г.

Пры ўтварэньні зьмены рэек, правесьці канцэнтрацыю цяжкіх рэек на лініях з найбольшай грузанапружанасьцю і ліквідаваць на гэтых лініях празпалосіцу і розны тып рэек.

Арганізаваць больш дакладны дагляд за верхняй будоўляй шляху, палепшыць падбор кадраў па нагляду за шляхамі і снабжэньні іх неабходным струмантам, матэрыяламі, забясьпечыўшы ўтрыманьне шляхоў у поўнай спраўнасьці.

ПА ВАДАСНАБЖЭНЬНЮ

Асаблівае значэньне для бесьперабойнай работы чыгуначнага транспарту мае водаснабжэньне, якое зьяўляецца ў сучасны момант, у выніку надзвычайнай няўвагі з боку чыгуначных арганізацый да гэтага пытаньня, адсутнасьці дастатковых тэхнічных сродкаў і зусім нездавальняючай пастаноўкі труб і абсталяваньня для водаснабжэньня адным з найбольш неблагапалучных вучасткаў чыгуначнай гаспадаркі.

А. Прызнаючы правільнасьць канцэнтрацыі работы па водаснабжэньні ў першую чаргу на дарогах Донбасу, Урал-Кузьнецкага камбінату і Турксібу, пленум ЦК прапануе НКПС узяць пад асобны кантроль утварэньне работ па водаснабжэньні, прыняўшы ўсе неабходныя меры да сканчэньня іх да асеньня-зімовых перавозак.

Б. Адзначаючы зусім недастатковы выраб труб, бэтонных частак, насосаў, катлоў і іншых элемэнтаў абсталяваньня на водаснабжэньні, пленум ЦК прапануе ВСНГ забясьпечыць дастаўку транспарту чыгуначных і водаправодных труб у бягучым годзе ў разьмеры 46,3 тысячы тон і выкананьне ўсіх прадугледжаных плянам заказаў на абсталяваньне па водаснабжэньні.

IV. Матар'яльна-тэхнічнае снабжэньне чыгуначнага транспарту

Прызнаючы недастатковым колькасьць рухомага складу і яўна нездавальняючы стан шляховай гаспадаркі (нізкі тэхнічны ўзровень рэйкавай гаспадаркі, недастатковасьць апалавай гаспадаркі, запушчанасьць і дрэнны стан палосы) у сувязі з нездавальняючым матэрыяльна-тэхнічным снабжэньнем транспарту, пленум ЦК, падкрэсьліваючы народна-гаспадарчае і абаронне значэньне чыгуначнага транспарту, прапануе ВСНГ СССР:

А. Забясьпечыць падвышэньне ўзроўню матэрыяльна-тэхнічнага снабжэньня транспарту ў поўнай адпаведнасьці з запраектаванымі плянамі і дамагаючыся карэннага палепшаньня якасьці пастаўлянай транспарту прадукцыі.

Б. У якасьці асаблівага адказнай задачы паставіць безадкладнае пашырэньне вытворчасьцей, зьвязаных са снабжэньнем транспарта, прыраўнаўшы снабжэньне іх як у галіне вытворчасьці, так і ў частцы капітальных работ да ўдарных будоўляў і забясьпечыць сваячасовае выкананьне заказаў транспарту ў адпаведнасьці з падрыхтоўкай яго да асеньня-зімовых перавозак.

В. Забясьпечыць у бягучым годзе поўнае выкананьне заказаў транспарту на рухомы склад: паравозаў—1038, таварных вагонаў і цыстэрн—47.000 (у дзьвюхвосным вылічэньні), пасажырскіх вагонаў—1467.

Г. Паставіць транспарту рэйкі ў разьмеры 597 тысяч тон і поўнасьцю выканаць заказы на рэйкавыя крапленьні, стрэлкі і краставіны.

Д. Забясьпечыць поўнае і сваячасовае выкананьне заказаў на запасныя часткі для паравозаў і вагонаў.

Е. Прыняць усе неабходныя меры да таго, каб ужо ў бягучым годзе зжыць усе якасныя дэфэкты ў пастаўляным транспартам прадукцыі асаблівa па рэйках і бандажох, для чаго ўзмацніць работу тэхнічнага кантролю і лябараторнай па якасьці на мэталюргічных заводах прыцягваючы для гэтага замежны тэхнічны вопыт.

Ж. Забясьпечыць чыгуначны транспарт неабходнымі матэрыяламі і апаратурай для самага шырокага ўжываньня цягавай і электрычнай накладкі новых тыпаў.

З. Паставіць чыгуначнаму транспарту ў бягучым годзе 22 мільёны штук шпал.

І. Арганізаваць выраб неабходнага абсталяваньня для пашырэньня існаючых і пабудовы новых шпала-прапітачных заводаў.

К. Прыступіць да вырабу абсталяваньня для себеначных і гравільных заводаў.

Пленум ЦК прапануе НКПС павесьці рашучую барацьбу з марнатраўствам у выдаткаваньні мэталю на транспарце і даручае НКПС распрацаваць і ажыцьцёвіць рад практычных мерапрыемстваў, спрыяючых эканоміі мэталяў (зьмяншэньне выдаткаў пры апрацоўцы, пашырэньне ўтылізацыйных цэхаў, замена мэталю іншымі менш дэфіцытнымі матэрыяламі, шырокае ўкараненьне электра і газавай зваркі і г. д.).

V. Па заводах ВОРЗ

Адзначаючы нездавальняючую арганізацыю рамонтнай справы на заводах ВОРЗ, дрэнную якасьць рамонту паравозаў, невыкананьне дырэктыў ЦК аб пераводзе заводаў з чэрвеня на гаспадарчы разьлік, надзвычайна недастатковае скарыстаньне замежнага вопыту, пленум ЦК прапануе НКПС:

А) Забясьпечыць у найкарочшы тэрмін ажыцьцяўленьне рашэньняў ураду і партыі па палепшаньні якасьці рамонту паравозаў на заводах ВОРЗ, шырокаму скарыстаньню замежнага вопыту ў рамонтнай справе, зьніжэньне сабекошту і прастояў у рамонце.

Б) Фарсаваць намечаную рэканструкцыю заводаў, на падставе дасягненьняў замежнай тэхнікі ў рамонтнай справе, забясьпечыўшы ў першую чаргу рэканструкцыю заводаў, абслугоўваючых раёны з найбольшым грузазваротам.

В) На працягу 1931 году склясьці пляны рэканструкцыі існуючых заводаў ВОРЗ і будаўніцтва новых заводаў (у першую чаргу на Ўрале, у Сібіры і Далёкім Усходзе) з тым, каб у 1932 годзе прыступіць як да ажыцьцяўленьня рэканструкцыі, так і да пабудовы новых заводаў.

Г) Абавязаць НКПС узяць пад свой нагляд выкананьне заводамі ВОРЗ заказаў па снабжэньні транспарту запаснымі часткамі і абсталяваньнем, прадугледжаных плянам 1931 г.

VI. Аб гаспадарчым разьліку на транспарце

Адабраючы пастанову СНК СССР аб зьмене сыстэмы фінансаваньня і рашэньне НКПС аб пераводзе з першага ліпеня на гаспадарчы разьлік дырэкцый дарог, раёнаў, дэпо і іншых нізавых вытворчых адзінак, а таксама ўсіх будаўнічых і гаспадарчых органаў транспарту (НКЗС буд, будаўнічыя трэсты, будаўнічыя вучасткі, ВОРЗ і яго заводы ВОЛТ, транлесы і трангасы), пленум надаючы выключна важнае значэньне правядзеньню гаспадарчага разьліку на транспарце прапануе НКПС і ўсім яго органам на працягу другога паўгодзьдзя дамагчыся сапраўднага правядзеньня гаспадарчага разьліку і на гэтай аснове зьніжэньня сабекошту і агульнага палепшаньня работ транспарту. Улічваючы, што ўкараненьне гаспадарчага разьліку патрабуе безадкладнага і рашучага палепшаньня вучоты і справаздачнасьці на транспарце, пленум прапануе НКПС у найкарочшы тэрмін забясьпечыць належную іх пастаноўку.

VII. Плянаваньне перавозак і ўзаемаадносіны транспарту з кліентурай

Пленум ЦК лічыць абсалютна недапушчальным нерацыянальнае скарыстаньне гаспадарчымі органамі і катэгарычнымі арганізацыямі перавозачных сродкаў транспарту. Сустрэчныя перавозкі, затрыманьне рухомага складу пад пагрузкай і выгрузкай, нераэльныя заяўкі і нескарыстаньне ў сувязі з гэтым рухомага складу падаваемага пад пагрузку, нескарыстаньне кліентурай найбольш спрыяючага часу летняга перыяду для завозу масавых грузаў (руда, апал, сыравіна, прамтавары).

А. Пленум ЦК адабрае рашэньне СНК аб стварэньні камітэту па перавозках, задачай якога зьяўляецца плянаваньне перавозак і забясьпячэньне лепшага скарыстаньня кліентурай транспартных сродкаў, правядзеньне чоткай дысцыпліны ў адносінах кліентуры, ліквідацыі сустрэчных перавозак.

Б. ЦК нацкампартый, абкомы і крайкомы узяць пад асаблівы нагляд выкананьне ўстаноўчых плянаў перавозак, сваячасовая нагрузка, разгрузка падвоз, вывяз грузаў і г. д., регуляваньне перавозак для вобласьцей і раёнаў.

В. Прапанаваць СНК правесьці неабходныя мерапрыемствы, узмацняючыя матар'яльную і судова-адміністрацыйную адказнасьць як дзяржаўных органаў, так і транспарту і іх адказных работнікаў на парушэньне вызначаных плянаў перавозак і ўмоў скарыстаньня рухомага складу.

Г. Прапанаваць камітэту па перавозках узяць пад асобны нагляд летні завоз руды, вугля, солі, вапнаванага каменьня, дроў, а таксама забясьпячэньне перавозак у напрамках у Сярэднюю Азію і на Далёкі Ўсход.

Д. ВСНГ безадкладна разгарнуць работу па палепшаньні заводзкага транспарту і пад'язных шляхоў, асабліва Данбасу, Уралу і паўднёвых пунктаў папрузкі і выгрузкі, правёўшы іх з уздымам разгортваньня вытворчасьці і чоткіх перавозках.

VIII.

1. Канстатуючы, што НКПС і дырэкцыямі дарог яшчэ не праведзена да канца рашэньне ЦК і СНК аб рэарганізацыі чыгуначнага транспарту ў адносінах узмацненьня сярэдніх (раёнаў і нізавых (дэпо), станцый і дыстанцый (гаспадарчых зьвеньняў транспарту), пленум абавязвае НКПС і дырэкцыі дарог поўнасьцю правесьці выкананьне гэтага рашэньня і ў сваёй далейшай рабоце выходзіць з неабходнасьці ўзмацненьня раёну, як важнейшага гаспадарчага зьвяна ў сыстэме чыгуначнага транспарту.

2. Улічаючы надзвычайную недастатковасьць насычэньня інжынэрна-тэхнічным пэрсаналам, пленум прапануе СНК поўнасьцю забясьпечыць фінансаваньне падрыхтоўкі кадраў на пляне, і адзначае нездавальняючае разгортваньне работы па капітальным будаўніцтве ВНУ, тэхнікумаў і ФЗУ.

У адпаведнасьці з плянам рэканструкцыйных работ, прапанаваць НКПС перабудаваць работу падрыхтоўкі кадраў для транспарту.

4. Абавязаць НКПС правесьці падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў на транспарце, дыспэтчэраў, адмінпэрсаналу, тэхнічнага пэрсаналу, дэпо, электрацягавікоў, цягавікоў эксплёатацыйнікаў і г. д. у мэтах падвышэньня іх кваліфікацыі і забясьпячэньня найбольш інтэнсыўнага правядзеньня рэканструкцыйных мерапрыемстваў. Пленум ЦК прапануе НКПС рашучым чынам палепшыць інструкцыйнае кіраўніцтва і работаздольнасьць транспартнага апарату, асабліва ўпраўленьне і кіраўніцтва месцамі шляхам сыстэматычнага выезду кіруючых работнікаў НКПС, дырэкцыі дарогі і раёнаў на месцы, рашучай барацьбы з коснасьцю, бюракратызмам у транспартнай гаспадарцы, неадкладных адказаў на запытаньні і поўнае скарыстаньне ініцыятывы органаў і паасобных работнікаў чыгуначнага транспарту па палепшаньні чыгуначнай гаспадаркі і яе работы і сваячасовай праверкі выкананьня рашэньняў партыі і ўраду на транспарту.

IX. Аб заработку і жыльлёва-бытавых пытаньнях

Адабраючы рашэньні ПБ ЦК ад 10-1-1931 г. аб падвышэньні заработку важнейшым групам чыгуначнікаў (што дае ў сярэднім падвышэньне заработку на 12 проц. замест прадугледжаных плянам 8 проц.) пры сярэднім заработку ў адпаведнасьці з якасьцю выконваемай работы і падвышэньня прадукцыйнасьці працы, а таксама рашэньня па палепшаньні снабжэньня чыгуначнікаў, жыльлёвым пытаньні і бытавых умовах, пленум ЦК прапануе:

1. НКПС і ЦК чыгуначнікаў поўнасьцю ажыцьцёвіць дырэктывы ЦК па максымальным ужываньні зьдзельнай аплаты на чыгуначным транспарце і шырокім прымяваньні рабочага за прыкладную ўзорную работу.

2. Распрацаваць і правесьці ў найкарочшы тэрмін дадатковыя мерапрыемствы па палепшаньні матар'яльна-бытавых умоў для высока-кваліфікаваных работнікаў на ўкраінных дарогах (Сібір, Далёкі Ўсход, Сярэдняя Азія, Мурманская чыгунка).

3. Надаючы асаблівa важнае значэньне справе забясьпечаньня жыльлём работнікаў і адзначаючы нездавальняючы ход гэтага будаўніцтва, абавязаць НК Шляхаў зносін выкананьне намечанага пляну жыльлёвага будаўніцтва для гэтага прадугледзець у трэцім квартале неабходныя матар'яльныя фонды і грашовыя асыгнаваньні.

4. Абавязаць Наркамснаб і Цэнтрасаюз прыняць меры да далейшага палепшаньня забясьпечаньня чыгуначнікаў, рашучага забясьпечаньня рабочых транспартнай каапэрацыяй, шырокага разьвіцьця грамадзкага харчаваньня, прыстасоўваючы яго да асаблівых ўмоў работы транспартнікаў (круглае сутачнае абслугоўваньне).

X. Аб прафэсыянальнай і партыйнай рабоце на транспарце

Адзначаючы вядомае палепшаньне партыйнай і прафэсыянальнай работы на транспарце на аснове правядзеньня рашэньняў ЦК і СНК ад 15-I-1931 г., узмацненьне мабілізацыі партыйных і рабочых мас вакол ажыцьцяўленьня сеткі рашэньняў партыі па адзараўленьні транспартнай гаспадаркі, пленум ЦК лічыць, што асноўнай задачай у рабоце партыйных і прафэсыянальных арганізацый павінна быць далейшая мабілізацыя шырокіх мас на аснове вытворчай актыўнасьці і росту сацыябарніцтва і ўдарніцтва, на барацьбу за палепшаньне работы транспарту і ліквідацыі выпікаў шкодніцтва, з засьмечанасьцю ў радох выпадкаў транспартнага апарату чужымі элемэнтамі, праяўленьнем клясавага ворага і шкодных элемэнтаў ў транспартнае асяродзьдзе.

Асаблівая ўвага павінна быць аддадзена рашучаму ўзмацненьню нізавых партыйных і прафэсыяльных зьвеньняў, цэху, групы, брыгады. Пленум абавязвае фракцыю УсеЦСПС, ЦК чыгуначнікаў, крайкомы і райкомы партыі ўжыць неабходныя захады да ўзмацненьня партыйнай і прафэсыянальнай работы асаблівa гэтых зьвеньняў. Вырашэньне вялізарных, пастаўленых перад транспартам задач, магчыма толькі пры ўмове рашучай перамогі коснасьці і бюракратызму ў рабоча-транспартных арганізацый, пры ўмове большага набліжэньня мясцовых партыйных і прафэсыянальных арганізацый да пытаньняў і патрэб транспарту, чоткай увязкі гаспадарчых арганізацый чыгуначнага транспарту з агульнымі задачамі гаспадарчага разьвіцьця раёнаў. Побач з гэтым пленум адзначае, што з боку краёвых, абласных і раённых камітэтаў партыі не ажыцьцяўляецца ў дастатковай меры дырэктыва ЦК аб узмацненьні іх работы на транспарце. Разьвіваючы пасьлядоўна шырокую палітычную работу на транспарце партарганізатараў, пленум падкрэсьлівае ў той-жа час, што ні ў якой ступені ня зьнімае адказнасьць за работу транспарту мясцовых і абласных партарганізацый. Пленум зазначае, што ажыцьцяўленьне вялізарных гаспадарча-палітычных задач, якія стаяць перад транспартам, патрабуе згрупаваньня галоўнай увагі на замацаваньні спаранай язды, узмацненьні адзінаначальля, на рашучай барацьбе за працоўную дысцыпліну, перамозе бюракратызму ў галіне кіраваньня транспартам, безадкладнай разгорнутай падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак і бальшавіцкім правядзеньні карэннай рэканструкцыі матар'яльна-тэхнічнай базы чыгуначнага транспарту.

Транспарт—неадымная частка сацыялістычнай рэканструкцыі краіны — павінен разьвівацца ў поўнай адпаведнасьці з агульным разгортваньнем сацыялістычнага будаўніцтва.

ВАРАШЫЛАУЦЫ!

Па вас будуць раўнацца ўсе рабочыя БССР у падпісцы на пазыку. Ваш завод павінен ня толькі выканаць, але і значна перавыканаць заданьне

АСОАВІЯХЭМАУЦЫ!

У першыя рады барацьбітоў за выкананьне і перавыкананьне плянаў рэалізацыі пазыкі „3-га рашаючага“

За бальшавіцкую рэалізацыю пазыкі „Трэцяга рашаючага“

Варашылаўцы, станьце прыкладам для ўсіх прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў БССР у рэалізацыі пазыкі

Зварот Наркамфіну СССР да рабочых заводу імя Варашылава

Таварышы! Па волі мільёнаў працоўных мас, савецкі ўрад выпусьціў пазыку «Трэцяга рашаючага году пяцігодкі». Гэта найвялікшая пазыка сацыялістычнага наступленьня, пазыка якая забясьпечыць заканчэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне. З вялікім уздымам, з энтузіязмам сустрэла новую пазыку рабочая кляса, масы калгасьнікаў і працоўнага бядняцка-серадняцкага сялянства. З усіх канцоў Савецкага саюзу паступаюць ужо весткі аб тым, што рабочыя нашай краіны таксама энэргічна прыступілі да рэалізацыі пазыкі, з такой-жа актыўнасьцю, з якім напружаньнем і энэргіяй яны выконваюць прамфінплян сваіх прадпрыемстваў. Пачынае разгортвацца хваля сацыялістычнага спаборніцтва на больш пасьляховае разьмяшчэньне пазыкі паміж паасобнымі фабрыкамі, заводамі, прадпрыемствамі. Пашыраецца хваля ўдарніцтва за больш шпаркае, [illegible]чэйшае сканчэньне рэалізацыі.

Народны Камісарыят Фінансаў СССР вылучыў рад прадпрыемстваў у якасьці паказальных у Саюзе па правядзеньні кампаніі пазыкі «Трэцяга рашаючага году пяцігодкі». Гэтыя прадпрыемствы павінны стаць прыкладнымі, вядучымі ў пазыковай кампаніі ва ўсім Саюзе. Сярод гэтых прадпрыемстваў таксама ваш завод.

Таварышы Вы пасьляхова выконваеце сваю пяцігодку, вы праяўляеце гераічныя намаганьні ў выкананьні свайго прамфінпляну. Будзьце таксама прыкладнымі і ў рэалізацыі пазыкі. Пастаўце гэту палітычную задачу дню ў цэнтры ўвагі ўсяго заводу, у цэнтры ўсёй бягучай масавай работы.

Пазыковая кампанія высоўвае рад задач. Першая ваша задача зараз—гэта арганізаваць справу так, каб ударнымі тэмпамі, па-бальшавіцку правесьці ў сябе рэалізацыю. Зрабеце так, каб у 5—10 дзён кожны рабочы на вашым заводзе ведаў падрабязнасьці аб новай пазыцы, ведаў-бы аб яе прызначэньні, аб пабудове пазыкі, яе асаблівасьцях і выгодах, якія яна дае падпісчыку. Зрабеце так, каб у гэтыя 5—10 дзён не засталося на вашым заводзе ніводнага рабочага па-за падпіскай на пазыку. Мабілізуйце на гэту справу лепшыя свае сілы, лепшых актывістаў, ударнікаў, пастаўце на ногі вашы камісіі садзейнічаньня і пад кіраўніцтвам вашай партыйнай ячэйкі і заводзкага камітэту, ажыцьцяўляючы асноўны лёзунг кампаніі—«трохтыднёвы заработак—у пазыцы», правядзеце ў сябе ў гэты тэрмін поўнасьцю падпіску.

Майце пры гэтым на ўвазе, таварышы—пастаўленую задачу, вы павінны вырашыць шляхам шырака разгорнутай агітацыйна-растлумачальнай работы, толькі пры абавязковай умове аб салютнага захаваньня прынцыпу добраахвотнасьці на аснове выпрабаваных мэтадаў сацпаборніцтва і ўдарніцтва.

У будаўніцтве сацыялізму бальшавікі ведаюць і даюць прыклады нябачных тэмпаў. Мы даганяем перадавыя капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічных адносінах і дагонім іх у тэрмін, намечаны партыяй і ўрадам—у 10 і менш год. Лёзунг—«тэмпы рашаюць» ўваходзіць у плоць і кроў кожнага рабочага ля варштату, трактарыста на трактары, калгасьніка на полі. Рабочая кляса давядзе, што пры яе актыўнасьці, арганізаванасьці і згрупаванасьці можна ў нашых умовах правесьці таксама вялікую гаспадарча-палітычную кампанію па пазыцы ў найкаротшы тэрмін. Ваша прадпрыемства павінна адным з першых паказаць гэты прыклад. Па вас павінны будуць раўнацца фабрыкі і заводы вашага раёну, рабочыя калектывы ва ўсёй краіне.

Наркамфін СССР выказвае ўпэўненасьць, што апраўдаецца яго вывад і ваша прадпрыемства зробіцца сапраўды паказальным па правядзеньні кампаніі пазыкі «Трэцяга рашаючага году пяцігодкі».

Мы чакаем вашага рапарту аб сканчэньні ў вас падпіскі на пазыку ў бліжэйшыя дні.

За бальшавіцкія тэмпы ў рэалізацыі пазыкі.

Нам. Народнага Камісару Фінансаў Саюзу ССР

ГЕНКІН.

Ударнікі новай пазыкі

Комсамольцы першага хромавага цэху чырвонаштандарнага заводу „Бальшавік“, якія ідуць упераадзе на падпісцы на пазыку „3-га рашаючага“.

На здымку: т. т. Барздо, і Ліўшыц Б., якія падпісаліся на 150 проц. месячнага заработку і т. Кварэо, які падпісаўся на 125 проц. месячнага заробку.

Дамо сустрэчны плян рэалізацыі пазыкі „Трэцяга рашаючага“

Да ўсіх арганізацый, да ўсіх членаў Асоавіяхіму БССР

Героічны пролетарыят СССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі пераможна ажыцьцяўляе пяцігодку ў чатыры гады. Па радзе галін прамысловасьці пяцігодка выканана ў 2½ гады. У 3-м рашаючым годзе пяцігодкі—годзе завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі—уступаюць у строй 518 гігантаў індустрыі і павінна быць пабудована 1040 машынна-трактарных станцый. У СССР ліквідавана беспрацоўе. Калектывізавана звыш 53 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а па БССР—звыш 32 проц. На базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца кулацтва, я кляса.

Высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва павінны быць забясьпечаны фінансавай базай. Аднэй з крыніц мабілізацыі сродкаў працоўных зьяўляюцца дзяржаўныя пазыкі. У капіталістычных краінах дзяржаўныя пазыкі накіраваны на падрыхтоўку новай крывавай бойні, новага ўзброенага нападу на СССР. Пазыкі, якія выпушчаны савецкім урадам згодна запатрабаваньняў мільёнаў працоўных, скарыстоўваюцца на ўзмацненьне індустрыялізацыі і сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі.

Пачын электразаводцаў і рабочых Макееўкі аб выпуску пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі» знашоў шырокі водгук сярод працоўных.

Падпіска на пазыку, 100 проц. яе рэалізацыяй мы ўзмоцнім гаспадарчую моц і абароназдольнасьць СССР.

Арганізацыі трохсоттысячнай армі членаў Асоавіяхіму БССР павінны стаць актыўнымі арганізатарамі і агітатарамі за рэалізацыю пазыкі. Кожны член Асоавіяхіму павінен у першую чарту быць падпісчыкам на пазыку 3-га рашаючага году пяцігодкі на менш чым на трохтыднёвы заработак.

Цэнтральным Саветам Асоавіяхіму БССР заклікае ўсе арганізацыі, усіх членаў Асоавіяхіму:

1) Уключыцца ў правядзеньне ўдарнага дэкадніка з 15 па 25 чэрвеня, садзейнічаючы поўнаму ахопу падпіскай працоўных гораду, сацыялістычнага сэктару вёскі і аднаасобнікаў—бедняко ў і серадняко ў.

2) Усім ячэйкам Асоавіяхіму правесьці шырокую растлумачальную кампанію аб задачах пазыкі, даючы рашучы адпор агітацыі клясава-варожых элемэнтаў і выдзяліць ударныя брыгады ў дапамогу мясцовым арганізацыям для садзейнічаньня кампаніі на правядзеньні падпіскі.

Ц. С. заклікае ўсіх асоавіяхімаўцаў высунуць сустрэчныя пляны па падпісцы на пазыку «3-га рашаючага году» і прыняць самы актыўны ўдзел у ажыцьцяўленьні гэтых сустрэчных плянаў.

«Уперад да новых перамог».

(Сталін).

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму БССР.

100 проц. месячнага заробку на пазыку „III-га рашаючага“

Бабруйск, 14-VI. (Белта). За два дні падпіска на гуце «Камінтэрн» дала 17.000 руб.—50 проц. Рабочыя падпісаліся на 100 проц. месячнага акладу. Майстры т. т. Акудовіч і Валовіч падпісаліся на 200 проц. месячнага акладу. Канторшчык т. Брандаеўскі і статыстык т. Багатыроў падпісаліся на 250 проц. месячнага акладу. «Камінтэрн» выклікаў на спаборніцтва гуту «Кастрычнік».

Падпіска на пазыку прахадзіць на рэйкі ударніцтва і спаборніцтва

БАБРУЙСК. 13-VI (БелТА). Падпіска на пазыку «3-ці рашаючы» на дрэваапрацоўчым камбінаце дасягнула 50.000 руб.

БАРЫСАЎ. 13-VI (БелТА). Ход падпіскі на пазыку «3-ці рашаючы» на на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» ідзе поўным ходам.

Даць Чырвонай армії пісьменнага байца!

Зварот Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету Беларускай вайсковай акругі да Цэнтральнага Камітэту ЛКСМБ Зах. абкому УсеЛКСМ, да ўсёй рабочай і сялянскай моладзі БССР і Заходняй вобласьці

Дарагія таварышы!

Рабоча - сялянская моладзь нараджэньня 1909 г., увесень бят. году, уступаючы ў рады Чырвонай армії, сустрэнецца з новымі сродкамі баявой тэхнікі.

Баявую тэхніку Чырвоная армія пачала атрымліваць у выніку посьпехаў індустрыялізацыі, у выніку пасьляховаага выкананьня пляну пяцігодкі сацыялістычнай будоўлі, пляну ажыцьцяўлянага пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі.

Маладыя байцы прызыву 3-га рашаючага году пяцігодкі павінны будуць у найкарочшы тэрмін па ўдарнаму асвоіць тэхніку і быць гатовымі ў любы момант скарыстаць яе для абароны Савецкага Саюзу.

Баявая тэхніка Чырвонай арміі патрабуе пісьменных, тэхнічна падрыхтаваных, палітычна сьвядомых і дысцыплінаваных байцоў.

Весткі, паступаючыя ў Рэвваенсавет з розных раёнаў Беларускай вайсковай акругі, гавораць аб тым, што ліквідацыя нясьпісьменнасьці сярод прызыўнікаў 1909 г. нараджэньня праходзіць слаба.

Ужо ня раз Ленінскі камсамол бліскуча выконваў заданьні партыі і ў бурны пэрыяд грамадзянскай вайны і ў гераічнай барацьбе за сацыялістычную пяцігодку. Партыя заўсёды з посьпехам скарыстоўвала камсамол на самых адказных вучастках ваенных і неваенных фронтаў.

На гэты раз Рэвваенсавет зьвяртаецца да Цэнтральнага камітэту ЛКСМБ, Захабкому ЛКСМ і ўсіх камсамольскіх арганізацый з просьбай дапамагчы ліквідаваць нясьпісьменнасьць прызыўнай моладзі ў кароткі тэрмін, які застаўся. (1½-2 месяцы).

ІХ Усесаюзны зьезд УсеЛКСМ чоткa камендуў вузлавыя пытаньні ўдзелу камсамолу ў абароне краіны ў мірныя часы. Пад адзнакай выкананьня гэтых рашэньняў зьезду, камсамольскія арганізацыі БССР і захвобласьці павінны падхапіць ідэю гэтага звароту і бальшавіцкімі тэмпамі ажыцьцёвіць яе.

Новы камандуючы БВА Тав. Убарэвіч.

Уся маса камсамольцаў, камсамольскі актыў Асоавіяхіму ўсіх грамадзкіх арганізацый, ваеннаргі камсамолу павінны неадкладна ўключыцца ў паход за ліквідацыю нясьпісьменнасьці сярод прызыўнікаў 3-га рашаючага году. Стварэньне брыгад па вучоту, сумесна з ваенкаматамі, органамі палітасьветы і саветамі, нясьпісьменных і малапісьменных прызыўнікаў, груп для абучэньня пісьменнасьці рабочай і сялянскай моладзі, індывідуальнае шэфства кожнага камсамольца над нясьпісьменнымі і малапісьменнымі прызыўнікамі, шырокае сацыялістычнае спаборніцтва паміж прадпрыемствамі, калгасамі і г. д. па ліквідацыі нясьпісьменнасьці прызыўнікаў—вось прыкладныя маршруты гэтага паходу.

«Чырвоная Зьмена» і «Бальшавіцкі Маладняк»—баявыя газэты камсамолі Савецкай Беларусі і Заходняй вобласьці павінны стаць на чале паходу за ліквідацыю нясьпісьменнасьці прызыўнікоў, павінны мабілізаваць на гэту работу брыгады і пасты ўдарнікаў юнкораў.

Лёзунг вайсковай работы камсамолу на бліжэйшы

Другі этап культэстафэты

Узьняць працоўныя масы на барацьбу за выкананьне культпляну

Да фінішу культэстафэты зьнішчыць прарывы ў ліквідацыі няпісьменнасьці. Дабіцца баявых тэмпаў работы лікпунктаў улетку

Змагацца за адзіны культплян

Ліквідаваць прарывы ў культбудаўніцтве

Пытаньнем аб арганізацыі саветаў культбудаўніцтва НКА займаецца ўжо некалькі месяцаў. Для складаньня пра екту палажэньня склікалася нарада прадстаўнікоў устаноў і арганізацый, ле хто ў прыватнасьці быў на гэтых нарадах—у НКА ня памятаюць. Склады зены праект быў зацьверджан на ўсе беларускай нарадзе інспэктароў нарсьветы ў канцы сакавіка, пасьля чаго ін быў перададны ў заканадаўчыя органы.

Прыцыпам пабудовы адзінага культ пляну ў НКА, па словах т. Чарнова, магэтуль няма, бо няма яшчэ пастановы ўраду аб саветах культбудаўніцтва.

Як-жа стаіць справа з выкананьнем культпляну гэтага году?

У 1 канцэнтры навучаецца 575.000 дзяцей. Паводле даных на 20-III плян на ахопу дзяцей, падлягаючых усенавучу, выканан на 97,1 проц.

Па даных НКА ліквідацыі няпісьменнасьці было ахоплена на 1 сакавіка 60.000 (ці 96 проц. пляну, а на 20-III-31 г. навучалася ўжо толькі 71,5 проц. плянавай колькасьці. Колькі скончыла навучаньне яшчэ невядома, але, бязумоўна, процант будзе яшчэ меншы. Няпісьменных і малапісьменных падлеткаў па 82 раёнах і 3 гарадох (па якіх маюцца ў НКА зьвесткі) ахоплена навучэньнем 92,4 проц.

Па школьным будаўніцтве леташні плян быў выканан толькі на 40 проц. Зрыў пляну тлумачыцца адсутнасьцю рабочай сілы, будаўнічых матар'ялаў, асабліва дэфіцытных (цьвікоў, цэменту і інш.). На 1931 год на школьнае палітасьветнае будаўніцтва і рамонт асыгнавана па бюджэту 7.331.000 руб.

Будаўнічымі матар'яламі прыблізна на 100 проц. забясьпечаны толькі 48 раёнаў, а астатнія раёны забясьпечаны толькі на 10 проц. Каб выканаць плян школьнага будаўніцтва і ў астатніх раёнах, даны на месцы указаньні замест гонту крыць будынкі чарапіцаю, або саломай з глінай і наогул ужываць розныя спосабы, каб скараціць часова расход матар'ялаў, у якіх адчуваецца недахват.

Аб ходзе школьнага будаўніцтва з раёнаў зьвесткі ў НКА атрымліваюцца толькі адзін раз у год і то ня з усіх раёнаў.

Кіраўнік будаўнічай групы т. Клімаў тлумачыць гэта «аб'ектыўнымі» прычынамі: 1) адсутнасьцю ў РВК тэх нікаў, якія-б адказвалі за працу, 2) немагчымасьцю для інспэктароў нарасьветы даць у тэрмін неабходныя зьвесткі, 3) РВК, знаходзячыся на мясцовым бюджэце, амаль што да апошняга часу ня хочуць лічыцца з НКА, як з кіруючай ўстановай і не давалі зьвестак.

Бываюць выпадкі, калі будаўнічыя школьныя матар'ялы РВК выкарыстоўваюць не на прызначэньні (напрыклад у Дрысенскім раёне зьбіраліся пабудаваць камбінат са школьных будаўнічых матар'ялаў).

Дапамога дзяржаўных устаноў і грамадзкіх арганізацый выкананьню культпляну амаль адсутнічае. Больш таго, ня гледзячы на пастанову СНК БССР, сродкі на культпатрэбы радам арганізацый і ўстаноў датэтуль не пераданы органам Наркамасьветы, а некаторыя нават зусім іх не адлічвалі. Першае месца ў нявыкананьні ў гэтых адносінах дырэктыў ураду займаюць: ВСНГ, ЦСПСБ, Белкаапсаюз і Наркамснаб.

Трэба прымусіць ВСНГ, ЦСПСБ і іншыя арганізацыі выканаць дырэктыву ураду аб перадачы сродкаў на культбудаўніцтва органам Наркамасьветы. Трэба ўзьняць рабочыя, калгасныя, бядняцка-серадняцкія масы на барацьбу за выкананьне пляну культбудаўніцтва. Плян культурнага будаўніцтва рашаючага году пяцігодкі павінен быць выканан поўнасьцю.

Брыгада газэт «Савецкая Беларусь», ЗКП і ЦП Працаўсьветы: **Ф. Шкляева, М. Корбут, А. Чыж, А. Тарановіч, Е. Радштэйн, Кабакова, Цыпкіна, Бэрман, Павелковіч, Левіна.**

Ахапіць усіх няпісьменных лікпунктамі

На зводзе «Дрэваапрацоўшчык» доўгі час ня мог пачаць сваю работу лікпункт. Партыйны і камсамольскі калектывы замест аказаньня дапамогі ў справе належнай работы лікпункту займаліся разважаньнямі аб палітычным значэньні ліквідацыі няпісьменнасьці.

Усё-ж урэшце лікпункт пачаў працаваць. Спачатку заняткі лікпункту слухачы наведвалі надта дрэнна. Зараз-жа быў прыняты рашучыя меры да таго, каб ня заняткі лікпункту хадзілі ўсе малапісьменныя і няпісьменныя рабочыя заводу. Была праведзена шырокая растлумачальная работа аб значэньні ліквідацыі няпісьменнасьці. У выніку праробленай работы лікпункт зараз на едвае 40—45 чалавек.

Работа лікпункту праводзіцца метадам сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Слухачы лікпункту спаборнічаюць паміж сабою на лепшае ўсваеньне праграмы. Але-ж побач з гэтым маецца і вялікі недахоп у рабоце лікпункту, які заключаецца ў тым, што ня ўсе малапісьменныя і няпісьменныя выяўлены і ім ахоплены.

Вучот апошніх на заводзе павінна быць правесьці 23-я школа, якая прымацавана да апошняга. Для гэтага ад школы і ад культштаба была вылучана настаўніца 23-й школы тав. Левіна Цыля. Ёй для правядзеньня работы быў вылучан рабочы заводу т. Сай, але т. Левіна не раілася з ім як лепш правесьці вучот, а пачала камандаваць т. Саем. У выніках камандаваньня...

Заўком дагэтуль чакае выніжаў вучоту, а Левіна, зрабіўшы некалькі візытаў на завод кінула наведваць як завод, так і культштаб. Другіх прадстаўнікоў школа не дасылала, хаця было многа напамінак. 19-я і 4-я школы працуюць мала чым лепш за 23-ю. 19-я ужо 2 месяцы не дасылае сваіх прадстаўнікоў у культштаб, 4 за ўвесь час даслала толькі 3 разы; яны ніводнай пастановы культштабу ня выканалі.

Вока.

Ліквідавала сваю няпісьменнасьць і ў рады рабкораў

Я, хатняя работніца, доўгі час была няпісьменнай. Але прышла савецкая ўлада і яна пачала клапаціцца аб такіх няпісьменных, як і я. Пачалі адкрывацца лікпункты і вечэрнія школы. Я пачала таксама вучыцца ў лікпунце пры жакце № 6. і ў маі скончыла лікпункт.

Цяпер я магу чытаць і пісаць. І вось пішу вам у рэдакцыю. Цяпер я зразумела, што дрэнна быць няпісьменнай. Мы з уздымам наведвалі заняткі, прагулаў у нас ня было.

Мы, скончыўшы лікпункт, заклікаем няпісьменных, як мага хутчэй ліквідаваць няпісьменнасьць, каб прымаць больш актыўны ўдзел у нашым сацыялістычным будаўніцтве. Зараз я ўжо пісьменная і буду актыўным рабкорам.

Т. БАШМАКОВА.

Сталёвая коньніца

сацыялістычных палёў--МТС--насустрэч бальшавіцкаму ўраджаю

Правільнай арганізацыяй працы, шырокім укараненьнем зьдзельшчыны, разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва—зламаць усе перашкоды да ўборкі

Пастанова Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і Калегіі НК-РСІ БССР

Па пытаньнях аб залежах пасеўных матар'ялаў

1. Адзначыць, што рад раёнаў (Горацкі, Клімавіцкі, Копыскі, Дрыбінскі, Сеньненскі, Заслаўскі, Дубровенскі, Багушэўскі, Крупскі, Коханаўскі, Гомельскі і інш.) праявілі нядбайнасьць мяжуючую са злачынствам, у рэалізацыі пасеўных матар'ялаў прызначаных для весьнавой сяўбы, якія застаюцца і зараз ляжаць на складах райкаапсаюзаў і на чыгуначных базах. У радзе фактаў з боку цэнтральных арганізацый была праяўлена недапушчальная марудносьць у справе своечасовага завозу пасеўных матар'ялаў. Была таксама слаба ўлічана наяўнасьць дэфіцытнага насеньня (коранплодаў, сеяных траў і сіласных культур).

2. З боку НКЗему ня былі прыняты своечасовыя меры жорсткага рэагаваньня да гэтых раёнаў, винаватых у несваячасовай рэалізацыі пасеўных матар'ялаў.

Выходзячы з гэтага, прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і Калегія НК-РСІ БССР пастанаўляюць:

1) Прапанаваць РКК-РСІ: Горацкай Клімавіцкай, Копыскай, Дрыбінскай Сеньненскай, Заслаўскай, Дубровенскай Багушэўскай, Крупскай, Коханаўскай і Гомельскай высьветліць прычыны залежаў пасеўных матар'ялаў і вінаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці.

2) Указаць НКЗему на недапушчальна-марудные кіраўніцтва і несваячасовае рэагаваньне да гэтых раёнаў, а таксама на слабы вучот наяўнасьці на некаторых раёнах, асабліва дэфіцытных насенных матар'ялаў.

3) Прапанаваць РВК і НКЗ Бел. у 3-дзённы тэрмін рэалізаваць увесь насенны матар'ял і стварыць перакідку насеньня, асабліва такіх культур, якія яшчэ могуць быць засеяны (насеньня коранплодаў, сіласных культур і насеньне палявых траў).

4) Даручыць пракуратуры вызваліць найбольш злосных з вышэйпаказаных раёнаў, дапусьціўшых гэткае становішча і прыцягнуць да судовай адказнасьці.

Нам. Старшыні ЦКК КП(б)Бел.
Нам. Наркома РСІ БССР Гурэвіч.

МТС у бой за посьпех уборачнай

Уборачная кампанія—адна з самых адказных задач сельска-гаспадарчых работ. Машына-трактарныя станцыі, заканчваючы сяўбу, павінны пераключыцца на падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі, пасьляховае правядзеньне якое патрабуе ад усіх работнікаў МТС і ўсёй масы калгасьнікаў самай вялікай уважлівасьці, высокага працоўнага ўздыму.

Ужо зараз на радзе МТС распачата ўзмоцненая падрыхтоўка да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі: пра водзіцца вучот уборачнага інвэнтару, каб своечасова затрабаваць са складаў нехапаючыя часткі, рамонт яго там, дзе патрэбна. Ва ўсіх МТС раскладаны рабочыя плыны. 12 МТС Менскай інспэктарскай групы маюць ужо маршруты для пасоўваньня сілаарэзак. Апроч таго, на МТС складаюцца брыгады да малатарняў. Гэтае пытаньне мае вялікае значэньне, бо работа пры малатарні патрабуе пэўнай колькасьці рабочых рук, пэўнага колькаснага складу брыгады, а пры адсутнасьці 2-3 брыгадзіраў малацьба будзе ісьці або вельмі марудна, або зусім сарвецца.

Поруч з гэтым МТС дзейна дапамагаюць у рамонце ўборачнага інвэнтару калгасам. Калі ў калгасе маецца свая кузьня, дык калгасны інвэнтар рамонтуецца сіламі МТС пры каласе. Калі-ж кузьні няма,—МТС бяруць на сябе цалкам увесь рамонт, забясьпечваючы калгасы нават патрэбнаю колькасьцю жалеза.

Трэба, аднак, сказаць, што цэлы рад МТС не ўкамплектаваны сельска-гаспадарчымі ўборачнымі машынамі, асабліва касілкамі і жаткамі. Калі такая МТС, як Койданаўская, Слуцкая, Капыльская, Танесная поўнасьцю забясьпечаны ўборачным інвэнтаром, дык ёсьць і такія, як Менская, якая да сёньняшняга дня ня мае ніводнай жаткі. У сувязі з гэтым МТС на месцах падрыхтоўваюць для скарыстаньня калгасныя конныя жаткі, загатаўляючы для іх прыцэпкі, але, на вялікі жаль, не ва ўсіх раёнах масіца дастатковая колькасьць гэтых жатак па калгасах.

Неабходна зьвярнуць увагу на ненармальныя ўмовы работы трактарыстаў, што выклікае ажыцьцяленьне некаторых трактарыстаў уцякаць з трактароў. Ёсьць выпадкі, калі трактарыст не забясьпечваецца ні кватэраю, ні харчам, ні спэцвопраткай. Калгасы не зварочваюць на гэта ніякай увагі.

Мала таго, такія работы, як зачыстка трактара ў часе працы ад пылу, дробны рамонт трактара зусім ня ўлічваецца трактарысту ў працадні.

Усе гэтыя пытаньні ня былі прапрацаваны МТС разам з калгасамі своечасова і цяпер, пасьля правядзеньня весьнавой пасеўнай кампаніі, гэты, з першага погляду дробны недагляд, можа значна перашкодзіць уборачнай кампаніі. Упраждаваньнем гэтай справы павінны зараз-жа заняцца МТС і калгасы, бо сталае прымацаваньне складу работнікаў да адпаведнай машыны зьяўляецца рашаючым фактарам у барацьбе за высокую прадукцыйнасьць калектыўных сродкаў вытворчасьці, у барацьбе за ашчадные і прадукцыйнае скарыстаньне кожнага трактара, кожнай машыны.

Практыка пасеўнай кампаніі паказала вялікую неарганізаванасьць па калгасах тэрыторыі для апрацоўкі трактарам. Гэта дае меншую прадукцыйнасьць працы і большае выдаткаваньне гаручага. Да ўборачнай кампаніі трэба ліквідаваць і гэты недахоп. Загадзя вызначаная і абмеравая плошча дасьць матчымасьць увесьці правільную зьдзельшчыну, а прымацаваньне брыгад да пэўных вучасткаў уборачнай плошчы забясьпечыць адказнасьць брыгады за ўборку, за страты, за тэрміны ўборкі.

Наперадзе ад усіх у падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі ідзе Койданаўская МТС, якая цалкам сабрала і адрамантавала с.-г. інвэнтар, падрыхтавала рабочыя плыны, склала маршруты работы, заканчвае падрыхтоўку прычэпнага інвэнтару пад жаткі і конныя граблі. Гэтая-ж МТС забясьпечана добра падрыхтаванымі трактарыстамі і рулявымі.

Значна адстае ад усіх іншых МТС Менская, якая, здаецца-б, павінна быць паказным узорам у рабоце для іншых.

Агульнаю заганаю ўсіх МТС зьяўляецца асудтнасьць календарных планаў работ.

Усе гэтыя недахопы павінны быць выпраўлены. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, якія былі шырока распаўсюджаны вясною г. г., сваім далейшым разгортваньнем дапамогуць пасьляховае падрыхтоўцы і правядзеньні ўборачную кампанію.

Трэба памятаць, што уборачныя работы будуць праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Барацьба з кулаком, з падкулачнікам і з апартуністам—агентамі клясавага ворага—ёсьць неабходная ўмова, для таго, каб лепш падрыхтавацца і пасьляхова правесьці ўборку калгаснага ўраджаю. Арганізаваць адпор атакам клясавага ворага, разгарнуць барацьбу за выразнае правядзеньне клясавай лініі неабходна для таго, каб справіцца з уборкай, для таго, каб у перыяд уборкі ўзьняць новы масавы прыліў у калгасы.

Ударныя атрады сацыялістычнага земляробства—МТС павінны павесьці за сабою калгасьнікаў у рашучы бой за штаркасьць уборачных работ, за суцэльную калектывізацыю вёскі і ліквідацыю на яе аснове кулацтва, як клясы.

г. ш.

УБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ Ў ПОЎНАЙ ГАТОЎНАСЬЦІ

Саўгас Дукора Сьмілавіцкага раёну са значным спазьненьнем скончыў сяўбу. Прымаючы пад увагу гэты прарыў саўгас па ўдарнаму разгарнуў падрыхтоўку да касьбы і ўборку каноплы. Гэтае пытаньне прапацавана на паседжаньнях рабкому і на агульным сходзе рабочых. Рабочыя ўлічылі прарывы весьнавой сяўбы і на час сенаўборачнай кампаніі ўзялі на сябе абавязак гэтага больш не дапусьціць.

Камсамольская ячэйка саўгасу цалкам аддана справе падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі. Камсамольцы ўсе да аднаго мабілізаваны на гэтую работу.

У саўгасе маецца 5 касілак і 4 жняяркі, якія знаходзяцца ў поўнай гатоўнасьці да ўборкі.

Саўгас распачаў ужо касіць каноплю, прычым работа праходзіць сапраўды па ўдарнаму.

Рабселькоры саўгасу ідуць у першых радох ударных брыгад.

Ц. П.

Эканоміць гаручае

Жыткавіцкая МТС узяла курс на скарачэньне выдаткаваньня гаручага і зьменшыла сваю заяўку на яго.

Вядома, што справа гэта вельмі добрая, бо калі правільна паставіць вучот гаручага, усклаўшы на трактарыстаў і калгасьнікаў адказнасьць за выдаткаваньне яго, сачыць за тым, каб гаручае не раскрадвалася, не разьлівалася, дык, бясспрэчна, можна дасягнуць значнай эканоміі.

На справе-ж мы гэтага ня маем. Жыткавіцкая МТС замест жорсткай эканоміі піша Беладзяленьню, Трактарацэнтру, Заходняй канторы Саюзнафты ў Смаленск, Белхаапсаюзу, і райсаюзам аб тым, што заяўка на гаручае была складзена нерэальна і трэба яе павялічыць.

Гэтым МТС узяла стаўку на невыкананьне норм выдаткаваньня гаручага на трактары і падалей.

Няўменьне апчадна выкарыстоўваць гаручае на трактары зусім не зьяўляецца падставай для невыкананьня норм і ўвядзеньня гэтага ў сыстэму пры далейшай працы МТС.

Б—скі.

Барацьба на 2 франты ў мэдыцыне

(Тры дыскусыйных вечары ў Бел. Дзярж. мэдінстытуце)

Вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва і разгорнутае наступленьне сацыялізму па ўсім фронце на капіталістычныя элемэнты патрабуюць ад работнікаў тэарытычнага фронту актыўнага непасрэднага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, на падставе выкананьня генэральнай лініі партыі. Толькі чоткае правядзеньне асноў марксыцка - ленінскай тэорыі на ўсіх вучастках тэарытычнага фронту «можа ўзброіць практыкай ў іх барацьбе за сацыялізм, даўшы ім сілу арыен тоўкі, яскравасьць пэрспэктывы і ўпэўненасьць у рабоце» (Сталін).

Адным з найбольш адсталых вучастка ў сацыялістычнай будоўлі зьяўляецца фронт аховы здароўя. У ім, як і ўсюды тэорыя значна адстае ад практыкі. Распрацоўка тэарытычных і практычных праблем мэдыцыны і аховы здароўя, на падставе дыялектычнага матар'ялізму зьяўляецца актуальнейшай задачай сёньняшняга дню. Прарывы ў мінулым філёзофскім і прыродазнаўчым кіраўніцтве, якія ўскрыліся ў час нядаўніх дыскусый, закранулі і становішча на фронце мэдыцыны.

Мінулае так званае кіраўніцтва пры родазнаўчым фронтам стала на шлях меншавіцтвуючага ідэалізму, які мае мэтай завуаляваць, замаскаваць марксыцкай абалонкай барацьбу ідэалізму з марксызмам. Таму яно ня здолела пасьлядоўна праводзіць партыйнасьць у навуцы, праяўляючы апалітычнасьць і лібэралізм у артыкулах тав. Левіта, аб крызісе сучаснай мэдыцыны (у 5-м нумары часопісу: «Под знаменем марксизма», прысьвечаным XVI зьезду УсеКП(б), тав. Семашка — аб здароўі селян і ў яго прадмове да брашуры Кака аб адзіным дыспансэры і ў радзе артыкулаў т. Обуха і работнікаў яго інстытуту. Стаўшае на антымарксавыя пазыцыі меншавіцтвуючага ідэалізму ў кантакце з мінулым філёзофскім кіраўніцтвам, было кіраўніцтва прыродазнаўчым фронтам дапусьціла поўную сыстэму глыбокіх палітычных і тэарытычных скажэньняў марксызму-ленінізму: адрыў тэорыі ад практыкі і сьцьвярджэньне, што тэорыя абагнала практыку (Левіт), утаясамленьне посьпехаў сучаснага прыродазнаўства з марксызмам (Левіт, Левін і інш.) падмен матар'ялістычнай дыялектыкі генэтыкай (Левіт, Сераброўскі), пераход на пазыцыі аўтагенэзу, перакідаючага мост да тэолёгіі, беспрынцыпную барацьбу з мэханістамі, фармальны адыход ад мэханізму без дастатковай барацьбы з мэханістычнымі канцэпцыямі ў мэдыцыне. З другога боку група Обуха ігнаравала ролю і значэньне тэарытычных работ Леніна і Энгельса для прыродазнаўства і мэдыцыны, процістаўленьня ламарксыста Лесгафта Энгельсу-Леніну, перавялічвала ролю мінулых дзеячоў расійскай мэдыцыны (Боткін), як матэрыялістых і нават дыялектыкаў. Гэта група адрывала матэр'ялізм ад дыялектыкі і часам цалкам заставалася на вульгарна-мэханістычных пазыцыях. Такім чынам, абедзьве групы, прапагандуючы розныя бакі ламарксызму—група Обуха мэханаламарксызм, група Левіта аўтагенэтычныя погляды, якія грунтуюцца на тэлеалёгічных прынцыпах Ламарка, зьяўляюць па прыкладам зьмыканьня мэханізму з ідэалізмам. Антымарксыцкія канцэпцыі ў тэарытычнай мэдыцыне вялі да прааапартуністычнай практыкі, як адсут насьці чоткай клясавай лініі ў аховe здароўя, мэханічнага і някрытычнага перанясеньня тэхнічных форм мэдыцыны Заходняй Эўропы (дыспансэр) бяз зьмен зьместу іх работы. Работа аховы здароўя адрывалася ад вытвор часьці з пераважнай націсканм на быт; ня знайшлі адэкві ўдарніцтва і сацспаборніцтва і г. д.

Праца трактавалася, як атрута для арганізму (Вігдорчык), ацэнка ўмоў працы ў капіталістычным грамадзтве мэхаічна пераносілася на такавыя ў Савецкім Саюзе, тэорыя «пажытай інвалідзнасьці» у адказных працаўнікоў спрабавала даводзіць непрыстасавасьць да новых умоў разумовай працы прадстаўнікоў пралетарыяту і бядняцтва. Сялянства (Ганушкін). Усе гэтыя ілжэнавуковыя мэтафізычныя тэорыі, абвергнутыя савецкай сучаснасьцю і сацыялістычным будаўніцтвам, толькі вялікая частка тых ідэалёгічна шкодных клясава-варожых установак у мэдыцыне, якія неабходна ўскрываць і з якімі трэба весьці самую ўпартую і жорсткую барацьбу.

Ня лепш, а часам і значна горш абстаіць справа на мэдычным фронце ў БССР. Мы тут знаходзім ня толькі вы падковыя няўдалыя і ненавуковыя фармулёўкі, а поўныя сыстэмы клясава-варожых, антымарксыцкіх тэорый. У біалёгіі мы маем «арыгінальную» марфадынамічную тэорыю каморкі (Маўрадзіадзі), якая (тэорыя) тлумачыць узьнікненьне структуры каморкі ўзьдзеяньнем на субстанцыю каморкі асобай сілы, адарванай ад матэрыі. Гэтая наяўна віталістычная і ідэалістычная тэорыя адначасова ўключае ў сябе шмат элемэнтаў мэханізму: яна раз глядае каморку, як суму паасобных утварэньняў фізычных, хімічных, біалёгічных, з якіх кожнае паасобку мае сваю функцыю. Поўную сыстэму ілжэнавуковых антымарксыцкіх, часткова шкодных установак мы знаходзім у працах псыхіятрычнай клінікі, якая вульгарна мэханістычна зводзіць псыхіку на ўмоўныя рэфлексы і імкнецца зусім абыйсьціся бяз псыхалёгічных паняцьцяў.

Шмат прыкладаў варожых ідэалёгій у нацыянальні мы знаходзім у нашай мэдычнай прадукцыі. Вялікадзяржаўны шавінізм зьмыкаецца тут з беларускім нацыянал - дэмакратызмам і яўрэйскім шавінізмам у пытаньнях крывяных груп і расава - біалёгічнага індэксу. Тут бяссорамна «карыгуюцца» факты з мэтай паказаць, што «гонару ў грубасьці» жыхароў вёскі Жалязьнякоў, быццам калёністаў з Польшчы, адпавядае пэўная прапорцыя крывяных груп, расава - біалёгічны індэкс (Ленц, Верамецкая). Правільна тав. Скрыпнік ахарактарызаваў «расава - біалёгічны індэкс», як тэарытычную падставу фашызму. Формы «выраджэньня» у выглядзе хвароб, альбо менш прыстасаванага «канстытуцыйнага тыпу» выстаўляюцца вялікадзяржаўнікамі, як аргумэнт ніжэйшых рас, беларускімі нацдэмамі і яўрэйскімі шавіністымі, як довады нацыянальнай самабытнасьці (Левін, Дзіхцяр). У мэдычнай прадукцыі мы знойдзем шмат поўзучага эмпірызму, якім прасякнута амаль уся клінічная мэдыцына. Для прыкладу падам назву артыкулу Сало міна: «Выпадак эпідэмічнага мэнінгіту, вылечанага мэнінгакокавай сыроваткай». Ці можа аўтар навукова даказаць, што сувязь ёсьць у яго выпадку паміж сыроваткай і вылячэньнем, калі дзесяткі і сотні вылечваюцца і без сыроваткі? Артыкул Вішнеўскага аб лячэньні малярыі, прагрэсыўнага паралюшу і крывяных груп грунтуецца на 9 выпадках, якія разьмяжоўваюцца паміж 4 крывянымі групамі. Якую каштоўнасьць маюць вывады аўтара падобных лічбаў, што прадстаўнікі 3 і 4 груп лепш напраўляюцца ад малярыі?

На працягу 3-х вечароў адбывалася ў Мэдінстытуце пры перапоўненай аўдыторыі навуковых работнікаў, дактароў і студэнтаў дыскусыя аб ідэалёгічным фронце ў мэдыцыне. Асноўнымі дакладчыкамі былі т.т. Пропэр з Масквы (аб барацьбе на 2 франты ў мэдыцыне) і Кроль (аналіз мэдычнай прадукцыі ў БССР). Шмат выступаўшых таварышоў дапаўнялі дакладчыкаў.

Дыскусыя мае для Мэдінстытуту вялізарнейшае значэньне. Гэта толькі першыя крокі для наступленьня на тэарытычным фронце ў мэдыцыне.

Трэба на гэтым не застанавіцца і працягваць — крытычны аналіз мэдпрадукцыі ва ўсіх яе галінах. Толькі шырокай крытыкай і самакрытыкай, толькі рашучай барацьбой з шкоднымі і варожымі ўстаноўкамі ілжэнавуковых тэорый можна ўзброіць мэдыцынскіх навуковых работнікаў марксызмам-ленінізмам.

М. Кроль.

У бой за торф

Бесьперапынку--на тарфяныя масывы

Машыны ня могуць адпачываць, калі на тарфяным фронце прарыў, калі торфазаводам не хапае рабочай сілы

Тэрмінова даць торфазаводам рабочую сілу

Пусьціць у ход усе машыны, бе[illegible]кладна перайсьці на бесьперапынку

Тое значэньне, якое мае і павінен мець торф, як мясцовы апал для сацпрамысловасьці Беларусі, высоўвае справу торфаздабычы на першы плян і робіць яе галоўнай задачай сёньняшняга дню.

Неразуменьне ўсёй гаспадарча-палітычнай важнасьці гэтае задачы азначае простае ігнараваньне пастаноў камуністычнай партыі і савецкага ўраду што адсоўвае праблему энэргетыкі Беларусі на задні плян і зрывае такім чынам плянавае будаўніцтва, нашае гаспадаркі.

А гэта неразуменьне на сёньнешні дзень—відавочны факт, які канкрэтна выражаецца ў тым, што існуючыя ў нас торфазаводы і торфараспрацоўкі яшчэ і да гэтага часу не заявілі таго месца ў рабоце шмат якіх грамадзкіх, партыйна-камсамольскіх і прафэсыйных арганізацый і адпаведных устаноў (цэнтральных і месных, раённых).

Усякія спробы вытлумачыць і апраўдаць тое становішча, што маецца на торфараспрацоўках у сучасны момант, азначалі-б ні што іншае, як спробу замазаць гэтае становішча, захаваць балячкі, якія тэрмінова патрабуюць лячэньня і такім чынам сарваць выкананьне вызначаных плянам заданьняў 3-га рашаючага.

Паводле-ж вестак, атрыманых ад Белторфаб'яднаньня, становішча такое:

З 75 фармовачных машын на сёньняшні дзень працуе толькі 53, астатніх 22 машыны стаяць: 13 з тае прычыны, што не сабраны, а 9 проста ці то з-за адсутнасьці рабочае сілы, ці з якіх іншых прычын.

З 12 машын па вывырабу малагідраторфу працуюць толькі 8. Астатнія 4 машыны стаяць не сабранымі.

З 21 фрэзера працуюць толькі 2, а 19 астатніх таксама чакаюць зборкі.

Такія недупушчальныя праступныя адносіны да скарыстаньня машын гаворыць аб тым што шмат якія торфарабпрацоўкі недаацэньваюць і ігнаруюць машынізацыю торфаздабычы і тым самым абумоўліваюць проста недавыкананьне з дня на дзень плянавых норм, аб чым сьведчаць друкуемыя кожны дзень у нашай газэце зводкі.

Так, завод «Чырвоная Беларусь» да гэтага часу ня пусьціў у ход ніводнае машыны ня гледзячы на тое, што машыны цалкам гатовы да працы. Гэта-ж самае назіраецца і на іншых заводах, асабліва у выхадныя дні (завод «Гребенева», «Воля»).

Такое-ж катастрафічнае становішча маецца і ў пытаньні забясьпечаньня торфазаводу рабочай сілы.

Недаўкамплектаваньне апошняй складае па ўсіх заводах і торфараспрацоўках—40 проц. ад агульнай патрэбы мужчын і 57 проц.—жанчын.

Больш таго і тым рабочым, якія маюцца, працуюць ня так як сапраўды яны павінны былі-б працаваць, каб пагодзіна выконваць нормы выпрацоўкі. Апошняму шкодзіць зусім некультурная, недастатковая, патрабуючая тэрміновага палепшаньня культмасавая выхаваўчая работа сярод рабочых тарфянікоў, проста праступная неўрэгулянаванасьць пытаньня днёў адпачынку і іншае.

Так, у выніку таго, што торфазаводы не перайшлі ў большасьці на бесьперапынны тыдзень, цэлы рад іх («Гребенева», «Чырвоны Кастрычнік», «Ленінскі Шлях» і інш) у выхадныя дні з усімі машынымі, якія маюцца там, не працуюць, а праца аднаго дня заводу складае 10 проц. тыдзённае здабычы.

Што вынікае з гэтага мілюнку, які маецца на большасьці торфазаводаў, і чаго ён патрабуе на далейшае ад ўсёй савецкай і пралетарскай грамадзкасьці, грамадзкіх арганізацый, асабліва на месцах торфараспрацовак, ад Белторфаб'яднаньня, як ад кіруючай адзінкі, і сумежных устаноў і арганізацый (Нархампрацы і іншых)?

Перш за ўсё ёй вымагае дасканалага і тэрміновага ўрэгуляваньня пытаньняў нагрузкі маючыхся машын, хутчэйшай зборкі яшчэ не сабраных машын, разьмяшчэньня іх на больш важных вучастках. У першую чаргу павінен адказваць за гэта Белторф. Партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя і іншыя грамадзкія арганізацыі павінны безадкладна завастрыць увагу рабочых на важнасьці поўнага і рацыянальнага скарыстаньня машын.

Па другое, Белторфаб'яднаньне ў першую чаргу павінна з ўсёй вастрэтой і сур'ёзнасьцю паставіць пытаньне пра забясьпечаньне торфараспрацовак рабочай сілай. **Мясцовыя раённыя арганізацыі і камсамол павінны і абавязаны нарэшце зразумець гэтую справу і зрушыць яе з таго мёртвага пункту, на якім яна знаходзіцца зараз.**

Беларускі сацыялістычны тарфяны Данбас не павінен застацца без належнай рабочай сілы. Гэта абавязаны зразумець нарэшце ўсе.

І нарэшце апошняе: прамадзкія арганізацыі торфазаводаў і шэфы гэтых заводаў павінны падняць культмасавую выхаваўчую працу сярод рабочых-тарфянікоў на належную вышыню і забясьпечыць шырокае ўжываньне мэтадаў сацыялістычнай працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва, грамадзкі бухгар

С.

ДАМО СУСТРЭЧНЫ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДДЗЯ!

Падтрымаем заклік пралетарыяту горада Леніна

„Няма і ня можа быць лепш такой асновы для распрацоўкі сустрэчнага, як перавыкананьне плянаў другога паўгодзьдзя трэцяга году пяцігодкі, як спалучэньне распрацоўкі сустрэчнага другой пяцігодкі з плянам чацьвертага заключнага году першай пяцігодкі". (Са звароту Ленінградзкага аблпрафсавету да ўсіх працоўных СССР)

Прафсаюзы, станьце на чале сустрэчнага другой пяцігодкі

Праз паўгода мы, скончыўшы яшчэ сёлета пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі нашай краіны, уступім у чацьверты заключны год пяцігодкі.

Ёсьць поўная ўпэўненасьць у тым, што пад выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнае партыі, абапіраючыся на магутны энтузіязм працоўных, мы ажыцьцявім на практыцы высунуты партыяй лёзунг «Пяцігодка ў чатыры гады».

Зараз мы блізка падышлі да другой пяцігодкі. Рабочыя Ленінградзкага заводу імя Карла Маркса высунулі думку аб тым, што ужо час зараз-жа практычна прыступіць да абгаварэньня і складаньня сустрэчнага другой пяцігодкі. Гэтую ідэю падхапіў увесь ленінградзкі пралетарыят.

Ленінградзкі аблпрафсавет зьвярнуўся да ўсіх працоўных савецкага саюзу аб уключэньні ў абгаварэньне і складаньне сустрэчнага мільёнаў—сустрэчнага другой пяцігодкі. Ленінградзкі аблпрафсавет пастанавіў:

«стварыць спэцыяльную апэрацыйную брыгаду для папярэдняй распрацоўкі пытаньняў, якія зьвязаны са складаньнем на гораду і вобласьці сустрэчнага другой пяцігодкі і па стварэньні непасрэднага нагляду за ўсёй работай.

Брыгадзе да 1 ліпеня намеціць канкрэтныя мерапрыемствы, якія вызначаюць удзел прафсаюзных арганізацый ва ўсіх зьвеньнях выпрацоўкі сустрэчнага. Абкому кожнага саюзу арганізаваць апэрацыйную брыгаду для падрыхтоўкі сустрэчнага другой пяцігодкі, па адпаведных галінах прамысловасьці, прыцягваючы да гэтага лепшых ударнікаў і перадавых інжынэраў і тэхнікаў. Нізавым прафарганізацыям прыступіць да гэтай-жа работы у рамках заводу цэху, брыгады».

Ініцыятыва ленінградзкага пралетарыяту ўскалыхнула шырокія колы працоўных усяго Савецкага саюзу.

Сакратарыят УсеЦСПС вынес пастанову аб удзеле прафсаюзаў у складаньні народна-гаспадарчага пляну на 1932 г.

Цэлы рад прафарганізацый уключыліся ў распрацоўку плянаў чацьвёртага году пяцігодкі і плянаў другой пяцігодкі. Ужо вынесена адпаведная пастанова Усеўкраінскім ЦСПС, выклік Ленінграду прыняў Івана-Вазнесенскі аблпрафсавет, прафсаюзы Ніжэгародзкай і Заходняй абласьцей.

Сёньня мы друкуем адозву ЦСПСБ, які таксама ўключыўся ў падрыхтоўку сустрэчнага.

Гэта ставіць перад нашымі прафарганізацыямі па прадпрыемствах, адказьнейшую задачу—падрыхтоўку сустрэчнага мільёнаў.

У сваёй адозьве ЦСПСБ зварочвае ўвагу ўсіх профорганізацый на тое, што:

«Асновай сустрэчнага прамфінпляну другой пяцігодкі зьявіцца

Аб зьлёце піянэраў

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Згадзіцца з прапановай ЦБДКО аб скліканьні ў пачатку жніўня месяца г. г. Другога Усебеларускага зьлёту піянэраў, правёўшы папярэдне раённыя зьлёты.

2. Прапанаваць райвыканкомам і гарсаветам аказваць усялякае садзейнічаньне ў скліканьні і правядзеньні зьлёту піянэраў.

3. Для кіраўніцтва работай па скліканьні і правядзеньні Усебеларускага зьлёту піянэраў утварыць Урадавую камісію ў наступным складзе т.т. Чарвякоў (Старшыня Камісіі), Гнілякевіч (Намесьнік Старшыні), Галадзед, Чарнушэвіч, Гайдукевіч, Платун, Бялуга, Клімковіч і Маслакоў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.
11 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

Аб складзе Прэзыдыуму Вярхоўнага Суду Беларускай ССР

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Зацьвердзіць наступны склад Прэзыдыуму Вярхоўнага Суду БССР: т.т. Кроль (Старшыня Вярхоўнага Суду), Жылінскі, Шапіра, Штаер, Грыгарчук, Пінчыкаў і Мельнік; кандыдатамі: т.т. Шлык і Гапоненка.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.
11 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Камісіі Выканаўняй пры СНК БССР

пра выкананьне сыстэмай спажывецкай каапэрацыі пляну мабілізацыі сродкаў

1. Адзначыць, што плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва па сыстэме спажывецкай каапэрацыі БССР выконваецца зусім нездавальняюча (за пэрыяд студзень—май 1931 г. плян выкананы усяго на 60,3 проц., а на вёсцы толькі на 52 проц.); асабліва дрэнна выконваецца плян паянамнажэньня на вёсцы: плян першага кварталу выкананы на 46,5 проц., а плян на красавік—май—на 29,5 проц.

Камісія Выканаўняй устанаўляе, што Смалявіцкі, Бабруйскі, Дрыбенскі, Дубровенскі, Церахоўскі, Магілеўскі, Сіроцінскі, Вульскі і Хоцімскі райсаюзы ганебна праваліі выкананьне пляну збору пасёў (плян на гэтых раёнах выкананы менш чым на 15 проц.). Побач з гэтым Камісія Выканаўняй адзначае пасьпяховае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў у 2-ім квартале: Заслаўскім Райсаюзам, які выканаў плян паянамнажэньня 2-га кварталу да 10 чэрвеня на 92 проц. і Лельчыцкім Райсаюзам, які да 10 чэрвеня выканаў плян другога кварталу на 83,7 проц.

2. Такое зусім нездавальняючае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў у сыстэме спажывецкай каапэрацыі зьяўляецца вынікам:

а) апартуністычных адносін да справы мабілізацыі сродкаў і недаацэнкі гаспадарча - палітычнай важнасьці гэтай справы з боку значнай часткі райсаюзаў, якія фармальна-бюракратычна адносіліся да выкананьня свайго фінансавага пляну, займаліся мэханічным падагульваньнем лічбаў і ніякіх рашучых захадаў да ліквідацыі прарываў ня прымалі;

б) зусім слабага кіраўніцтва Белкаапсаюзам работай сыстэмы спажывецкай каапэрацыі па мабілізацыі сродкаў на сельніцтва;

в) нядбайных адносін часткі раённых выканаўчых камітэтаў да гэтай справы;

г) адсутнічаньня грамадзка - масавай работы, асабліва па лініі прафсаюзу работнікаў каапэрацыі і гандлю і слабай работы каапэрацыйных бюро, каапэрацыйна - крамных камісій па зборы паявых і мэтавых уносаў пайнікаў.

Вярнуўшы пад увагу памянёнае вышэй, Камісія Выканаўняй пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Белкаапсаюзу, пад адказнасьць тав. Стракоўскага:

а) ужыць рашучыя захады да поўнай ліквідацыі прарыву ў справе мабілізацыі сродкаў, падпарадкаваўшы гэтай задачы дзейнасьць усяго апарату сыстэмы спажывецкай каапэрацыі;

б) забясьпечыць у адпаведнасьці з дырэктывай ЦК КП(б)Б, пераважнае снабжэньне пайнікаў, якія акуратна выконваюць свае абавязкі перад спажывецкай каапэрацыяй па своячасовому ўнясэньні пая і мэтавых уносаў на будаўніцтва;

в) устанавіць сталы падлік запазычанасьці кожнага пайніка, а на вёсцы кожнага саўгасу і калгасу і пайнікаў-адпасобнікаў;

г) разам з прафсэкцыянальнымі арганізацыямі правесьці шырокую растлумачальную работу сярод пайнікаў за поўнае выкананьне і перавыкананьне пляну мабілізацыі сродкаў і разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж каапэрацыйнымі арганізацыямі, крамамі, работнікамі крам, каапэрацыйнымі бюро, каапэрацыйна - крамнымі камісіямі і паасобнымі каапактывістамі, прэміруючы іх за лепшае выкананьне заданьня па зборы сродкаў.

2. Папярэдзіць паказаньня ў арт. 1 гэтае пастановы Райсаюзы, што ў выпадку непрыняцьця імі рашучых захадаў да поўнага выканаьня пляну мабілізацыі сродкаў, яны будуць прыцягнуты да судовай адказнасьці.

3. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам неадкладна правесьці ход выканаьня спажывецкай сыстэмай пляну мабілізацыі сродкаў і прыняць рашучыя меры да хутчэйшай ліквідацыі прарываў у гэтай галіне.

4. Прасіць ЦКПСБ забясьпечыць непасрэдны ўдзел прафарганізацый, асабліва Саюзу работнікаў каапэрацыі і гандлю, у зборы паявых і мэтавых узносаў, шляхам мабілізацыі грамадзкай думкі работнікаў крам і ўзмацненьня і актывізацыі работы каапэрацыйных бюро, каапэрацыйна - крамных камісій і ўсяго каапэрацыйнага актыву.

5. Даручыць Белкаапсаюзу пры складаньні плянаў завозу прамтавараў улічыць неабходнасьць павялічанага завозу прамтавараў у тыя раёны, якія пасьпяхова выконваюць плян мабілізацыі сродкаў. Прыняць да ведама, што за зрыў пляну мабілізацыі сродкаў Белкаапсаюзам паменшан завоз прамтавараў для Барысаўскага, Вульскага і Хоцімскага райсаюзаў.

6. Для забясьпечаньня лепшага выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў у 3-м квартале, прапанаваць Белкаапсаюзу:

а) неадкладна даць паказаньні сваёй сеткі аб разьбіўцы кантрольных лічбаў па мабілізацыі сродкаў на III-ці квартал 1931 г. з давядзеньнем канкрэтнага заданьня да кожнай крамы, сельскага спажывецкага таварыства, каапэрацыйнага бюро, каапэрацыйна-крамнай камісіі і паасобных каапэрацыйных актывістых;

б) у сувязі з арганізацыяй у спажывецкай сыстэме аб'яднаньняў дробнага гандлю, распрацаваць кантрольныя лічбы па мабілізацыі сродкаў на III-ці квартал г.г. для кожнага аб'яднаньня асобна;

7. Абавязаць Белкаапсаюз безадклад на поўнізьцю ажыцьцявіць дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб разбраніраваньні таварных фондаў і давядзеньні таварных лімітаў.

Нам. Старшыні Камісіі Выканаўняй пры СНК БССР А. Калнін.
Сакратар Камісіі Выканаўняй пры СНК БССР Я. Элькін.
10 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Акруговая нарада жывёлагадоўчых саўгасаў

Учора ўвечары ў доме Калгасьнікаў адкрылася нарада дырэктароў і спэцыялістаў жывёлагадоўчых саўгасаў Белсаўгастрэсту. Нарада абгаворыць вынікі веснавой сяўбы, і плян падрыхтоўкі да ўборачнай і асенняй пасеўнай кампаніі, пытаньні зьдзельшчыны, жывёлагадоўлі, будаўніцтва і спэцыялізацыі саўгасаў.

Нарада працягнецца некалькі дзён.

Апартуністычная гніль у Крычаўскай прафарганізацыі

КРЫЧАЎ, 14-VI. (Белта). Прафсаюзная арганізацыя Крычаўшчыны ня выконвае важнейшыя партыйныя дырэктывы аб перабудове ўсёй прафработы тварам да вытворчасьці. Мясцкомы і рабочкомы бязьдзейнічаюць, а партыйныя ячэйкі ў плянах сваіх работ зусім абмінулі кіраўніцтва прафсаюзамі. Апартуністычная бязьдзейнасьць, непаваротлівасьць, закасьцянеласьць і бюракратызм—характэрныя рысы значнай часткі прафсаюзных арганізацый Крычаўшчыны. Ударніцтва, спаборніцтва, культмасавая работа у большасьці мясцкомаў ад сутнічаюць.

Райпрафсавет нядаўна распусьціў мясцком саюзу каапэрацыйных работнікаў. Распушчан і рабочком хлебапякарні.

Сыгналізацыя газэты «Сацыялістычны Шлях» аб зьсьмечанасьці каапэрацыйнага апарату клясава-варожымі элемэнтамі засталося без рэагаваньня. Палітычная сьлепата прывяла мясцком гэтага саюзу да таго, што прымаліся ў саюз адно, што выключаныя з шэрагаў КСМ за дэзэртырства з фронту сацыялістычнай будоўлі (Дворкіна і Таненбаўм).

Член мясцкому — Балоцін, будучы загадчыкам кнігарні, праводзіў сваю клясава-варожую палітыку ў распаўсюджваньні друку, выжываў з кнігарні літаратуры нацменшасьцяй і нарэшце пачаў адкрыта выступаць супроць партыйнага кіраўніцтва саюзам кажучы,—«камуністы нас на фракцыю не пушчаюць, дык хай яны і працуюць».

Меліся выпадкі і антысавецкіх выступленьняў з боку прымазаўшагася рабочага Язгуры. Калі перад веснавой сяўбой трэба было мабілізаваць на пару даён бухгальтэраў і рахункаводаў, дык яны паднялі лямант і закідалі райспрафсавет даведкамі ад урачоў і заявілі аб хваробе жонак, цяжар насьці, а другія проста катэгарычна адмаўляліся ад паездкі. Па ўстановах культгас дысцыпліна сярод работнікаў. На разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, глядзяць скрозь пальцы.

Саюз працаўсветы ў раёне не адчуваецца. У радзе школ раённай газэтай быў выкрыты антысэмітызм і шавінізм яж сярод вучняў, так і сярод настаўнікаў, але і пасьля гэтага саюз не прыняў адпаведных мерапрыемстваў, па разгортваньні інтэрнацыянальна-выхаваўчай работы, а абмежаваўся толькі выключэньнем з саюзу і зьняцьцем з працы.

Месячнік беларусізацыі, які праводзіўся прафсаюзамі, праваліны. Зараз зноў пачаўся месячнік генэральнай праверкі беларусізацыі, але прафсаюзы сьпяць.

Крычаўская местачковая парт'ячэйка, толькі тады займаецца кіраўніцтвам асобнымі мясцкомамі і рабочкомамі, калі трэба альбо распусьціць, альбо вынесьці пастанову аб адзнацы глыбокага прарыву.

З усяго гэтага вывад можна зрабіць толькі адзін—**апартуністычная гніль разьядае прафсаюзную арганізацыю Крычаўшчыны.** Патрэбна неадкладна ўзьняць на барацьбу з апартунізмам у прафсаюзах усю партыйную арганізацыю і здаровую частку прафсаюзаў.

Застаўшыяся дні правядзеньня месячніка праверкі перабудовы прафработы, павінны стаць выходным пунктам у павароце прафработы тварам да вытворчасьці, да баявой работы ў выкананьні задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Начныя зьмены ахапіць партыкіраўніцтвам

Па ініцыятыве **Віцебскай** РСІ і газэты «Віцебскі Пралетары» быў зроблен налёт на начныя зьмены фабрык і заводаў Віцебшчыны, дзеля праверкі стаўлення забясьпечаньня кіраўніцтва адміністрацыяй партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі начных зьменамі. У налёце прымалі ўдзел больш 30 актывістых рабкораў, якія выявілі, што большасьць прадпрыемстваў Віцебшчыны пастанову гаркому партыі аб недапушчэньні зрываў у працы начных зьмен ня выканалі.

Ні на аднэй фабрыцы не знайшлі дзяжурнага дырэктара, дзяжурнага прадстаўніка фабкому і членаў бюро парткалектыву. Брыгады уваходзілі на фабрыкі і заводы бяз усякіх прапускоў, з сабой пры выхадзе выносілі шмат розных тавараў, якія былі дастаўлены ў Віцебскую РСІ. Гэта кажа аб тым, што з аховай прадпрыемстваў справа вельмі дрэнна.

Адсутнічае культурная і масавая работа сярод рабочых начных зьмен. Гарачых сьнеданьняў няма, а тамсама буфэты ў начны час зачынены. У сувязі з гэтым мы маем значны процант невыканаьня прамфінпляну, які надае за лік працы начных зьмен.

Неабходна зараз-жа прыняць рашучыя меры па аздараўленьні становішча і працы начных зьмен. Вінаватых у невыкананьні пастаноў партыі па абслугоўваньні начных зьмен, ігнаруючых пастановы прыцягнуць да адказнасьці.

Брыгада «Сав. Бел.» С. МІРКІН і Н. ДВАРСОН.

Камбінат павінен ліквідаваць прарыў

(Ад нашага бабруйскага карэспанд.).

Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат увесь час ідзе ў выкананьні свайго прамфінпляну з ганебнымі прарывамі. Па асобных цэхах, як, напрыклад, па беладрэўным за апошні час выкананьня пляну зьнізілася да 35 проц. Мінулы склад заводзкіх арганізацый ня здолеў арганізаваць масы рабочых на ліквідацыю прарываў у выкананьні прамфінпляну, не паставіў у асяродак сваёй увагі шырокую мабілізацыю рабочых мас на гэтых прарывах.

У апошні час дрэваапрацоўчы камбінат наведаў старшыня Вышэйшага Савет Народнай Гаспадаркі БССР тав. Грысэвіч сумесна з прадстаўнікамі Лесбелу. У прысутнасьці тав. Грысэвіча і прадстаўнікоў трэсту была праведзена нарада адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, на якой высьветліліся прычыны прарываў на камбінаце.

Наведваньне тав. Грысэвічам камбінату ўзьняло працоўны энтузіязм рабочых камбінату.

На камбінаце абвешчаны штурм па ліквідацыі прарываў. Асобныя цэхі актыўна ўзяліся за ліквідацыю сваіх прарываў. Так, самы адстаючы беладрэўны цэх за апошнія дні даў значны рост выкананьня сваёй вытворчай праграмы, перавыканаўшы не за 26 мая на 25 проц. Астатнія цэхі паступова ўключаюцца ў штурм.

Штурм павінен быць шырока скарыстаны заводзкімі арганізацыямі для кіраваньня працоўнага ўздыму на поўную ліквідацыю ўсіх недахопаў працы камбінату, на ліквідацыю ганебнага адставаньня яго ў выкананьні вытворчай праграмы, на мабілізацыю мас на чоткую ўдарную бальшавіцкую работу.

Д. Аланскі.

Слухайце! Слухайце! Слухайце!

28-га чэрвеня Усебеларуская радыё-пераклічка падрыхтаванасьці да ўборкі ўраджаю.

У сувязі з Усебеларускімі манэўрамі падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю, якія абвешчаны газэтай «Калгасьнік Беларусі», рэдакцыя Беларускай радыё-газэты, «Калгасьнік Беларусі», Наркамфін БССР і Белкалгасцэнтр арганізоўваюць

28 чэрвеня, а 19 гадзіне (7 гадз. увечары) Усебеларускую радыё-пераклічку падрыхтаванасьці да ўборкі ўраджаю.

У пераклічцы ўдзельнічаюць: 3 райза, 4 райкалгассаюзы, 8 МТС, 2 саўгасы, 9 калгасаў, розных раёнаў БССР. Радыё-вузлы, МТС, саўгасы, калгасы, хаты-чытальні, клюбы, пардамы, наладжваюць масавае слуханьне радыё-пераклічкі

„Залаты пеўнік"

(Беларуская дзяржаўная студыя опэры і балету)

«Залаты Пеўнік» быў напісаны Рымскім-Корсакавым у 1906-1907 годзе. Гэтыя годы ў творчасьці Рымскага-Корсакава адзначаюцца стварэньнем некалькіх сацыяльна - значымых твораў. Да таго часу Рымскі - Корсакаў апроч «Залатога Пеўніка» напісаў вядомую «Дубінушку».

«Залаты Пеўнік»—опэра-сатыра, над зьвычайна моцна замаскаваная. Рымскі-Корсакаў, выпускаючы «Залаты Пеўнік», перажыў цэлы рад цяжкасьцяй пры яго пастаноўцы. За 2 гады да сьмерці, у 1908 годзе, Рымскі-Корсакаў у лісьце да свайго выдаўца Юргенсона, піша:

«Я збураны паведамленьнем Целякоўскага, і палазю літаральна вынімку з яго ліста да мяне: «...што-ж да «Залатога Пеўніка», дык справа абстаіць дрэнна. Маскоўскі генэрал - губэрнатар супроць пастаноўкі гэтай опэры і паведаміў аб гэтым цэнзуру».

Некалькі раней у другім лісьце Рымскі-Корсакаў піша:

«Пушкінскі верш «Царствуй у ложку на баку» усё-ж такі не прапускаюць. Уступ дазволены абсалютна, заключэньне абсалютна забаронена. У цэнзуры нават чытаць ня ўмеюць. Чорт ведае, што за ідыёты».

Царская цэнзура прычыплівалася да зусім «нявінных» месцаў. Так, замест «новая зара» цэнзура патрабавала паставіць «белая зара», замест «крывавая разьвязка», патрабавала—«нечаканая» і г. д.

Адсюль зусім зразумела чаму «Залаты Пеўнік» не паяўляўся на сцэне імпэратарскіх тэатраў і нават у тэатрах прыватнікаў, як Зіміна і інш.

Усё-ж такі, ня гледзячы на «дбайнасьць» царскай цэнзуры, мы ў тэксьце «Залатога Пеўніка» сустракаем адпаведную ацэнку царствуючага Дому Раманавых:

«Здымем войска мы з граніцы
Хай стаіць вакол сталіцы.
А ў сталіцы на 7 год
Яжы і пойла запасем»

Царскі двор марыць толькі аб «ежы і пойле»:

«Яжы і пойла, ну, вядома
Будзем жыць бясьпечна дома
Піва болей і віна
Вось такая-б нам вайна».

Або характарыстыка так званай пры дворнай арыстакратыі, чыноўніцтва, афіцэрства:

«Дай нам крышычкі ўздыхнуць
Хай паедуць заводы
Што царнець нам нявыгоды
Без каханак час гублянь...
Ня кідайся толькі ў бой
Сам заўсёды з-за ўсіх стой...»

Дом Раманавых, царскія заправілы, бязвольны цар, жандарскае праўленьне ўсе Русі-марыць аб пакорлівасьці народу.

«Конік сьмірны як карова
Нам і трэба вось такога...»

* * *

Калі Беларуская студыя опэры і балета ўзялася менавіта за гэты матар'ял для сваёй першай работы, яна зрабіла вельмі правільны крок. Добра што студыя не ўхапілася за выключна клясычную, у сэнсе вакальнасьці, опэры, як «Евгений Онегин», «Пиковая Дама» і г. д. Тут правал быў-бы ў наяўнасьці.

Калі для «ўнутранай» студыйнай работы такі матар'ял бязумоўна карысны, дык для показу, для палітычна-актуальнага спэктаклю гэтым матар'ялы не падыходзяць.

Задача студыі заключалася ў тым, каб гэтую глыбока замаскаваную палітычную сатыру на дом Раманавых, на царскі лад ускрыць, завастрыць, давесьці да апагею. Гэту задачу паставілі перад сабой пастаноўчык, мастак, вакальная частка опэры і з гэтай задачай студыя ў асноўным бязумоўна справілася.

Сатыра вострая, падкрэсьленая; памфлет злы і трапны — вось вынік першай лябараторнай работы будучага Дзяржаўнага Беларускага тэатру опэры і балету.

«Залаты Пеўнік» бязумоўнае дасягненьне, новы і каштоўны ўклад у культурнае будаўніцтва БССР. Гэта трэба сказаць з усёй шчырасьцю і ўпэўненасьцю.

Толькі таму, што «Залаты Пеўнік» першая і ўдалая работа будучага тэатру опэры і балету трэба і карысна зазначыць ва некаторыя недахопы пры пастаноўцы «Залатога Пеўніка».

У лібрэта, якое было раздана пры показе, мы чытаем: «У цэнтры ўвагі слухача ўвесь час знаходзіцца Палкан—грубая фізычная сіла, жандармэрыя, ахранка, на якую абапіраецца царызм».

Ці паказана гэта на самой справе? Ці ў цэнтры ўвагі Палкан? Не, у цэнтры ўвагі—Дадон-цар, Зьвездачот, Шамаханская царыца. Трэба сказаць, што ў «Пеўніку» не падкрэсьлена роля жандармэрыі. Мала апрануць Палкана ў мундзір жандара. Палкан атрымаўся бязвольны, слабы, адціснуты на задні плян опэры. Гэта ня «грубая фізычная сіла», гэта—ня царская жандармэрыя, душыцель рэвалюцыйнага руху, гэта не апора, на якой трымаўся царскі трон. У гэтай пастаноўцы Палкан-пакаёўка, з якога зьдзекуецца цар.

«Дурата, дурная галава».

Шамаханская царыца — увасабленьне замежнага капіталу, які імкнецца зрабіць Расію сваім рынкам,—у трактоўцы опэры разьвязана правільна. Але наўна думаць, што пераапранаць не на сцэне дае гледачу гэтае ўражаньне. Нельга спрашчаць і вульгарызаваць. Нават у лібрэта мы чытаем: «Шамаханская царыца — увасабленьне капіталу розных краін (розныя вопраткі)». Гэта—наўна.

Калі «Залаты Пеўнік» памфлет на царскую Расію, на дом Раманавых, дык нельга прыпісваць яму ўласьцівасьць фашызму ў той час, калі фашызм для царскай Расіі не характарны ,у той час як фашызм — вынік пасьляваеннага капіталізму. Нельга адцяняць увагу гледача ад гістарычнай праўды, трактаваць гістарычныя факты блытана.

Некалькі слоў аб афармленьні «Залатога Пеўніка».

Месцамі знадворнае афармленьне мае перавагу над музыкай, над словам, над дзеяньнем на сцэне. Знадворная награмаджанасьць і частковая перасычанасьць спэктаклю мастацкім афармленьнем не заўсёды падкрэсьлівае опэру.

Аб выкананьні. Аб гэтым трэба сказаць вось што.

Калі сярод усяго складу студыі мы можам вызначыць амаль закончаных опэрных артыстаў, як Каліноўскага—Дадон, Балоціна—Зьвездачот, Дзяніса — Эфрон і інш., дык трэба адзначыць слабыя месцы ў сэнсе выкананьня.

Асноўны недахоп — гэта тое, што слова не даходзіць да слухача. За выключэньнем Балоціна і часткова Каліноўскага — дыкцыя іншых акторaў вельмі слабая. Хор зусім не дае навод нага поўнага сказу.

Мы прасачылі за тэкстам «Залатога Пеўніка». Ёсьць месцы, якія па сваім літаратурным матар'яле маглі яшчэ больш падкрэсьліць гэтую палітычную сатыру (спрэчкі баяр на чым варажыць, провады Дадона і г. д.). Але ў выкананьні хору яны зусім губляюцца.

Студыі прыпадае вялікая работа над акторскім матар'ялам, слова павінна дайсьці да слухача, гэта — для новага тэатру закон.

Ня гледзячы на ўсе гэтыя недахопы, якія студыя павінна выправіць і бязумоўна здольна гэта зрабіць, трэба яшчэ раз падкрэсьліць бязумоўную карыснасьць, патрэбнасьць показу «Залатога Пеўніка». Студыя ў надзвычайна цяжкіх умовах стварыла гэты каштоўны спэктакль.

«Залаты Пеўнік» сьведчыць аб тым, што студыя здольна ператварыцца ў тэатр - опэру значна хутчэй, як гэта чакалася. Пастаноўка «Залатога Пеўніка» паказала, што студыя здольна справіцца з любым матар'ялам.

Студыя ў далейшым павінна накіраваць усю сваю ўвагу на стварэньне новай опэры, новай музыкі. Для гэтага ўсе даныя ў наяўнасьці.

Першую каштоўную работу студыі трэба паказаць рабочаму гледачу. «Залаты Пеўнік» — сацыяльна - каштоўная, палітычна - правільная опэра.

Стварэньне 1-ай Беларускай опэры яшчэ раз з ўсёй яскравасьцю паказвае правільнасьць нацыянальнай палітыкі ленінскай партыі, якая дала ўсе магчымасьці для стварэньня культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце. Усё гэта ставіць перад пралетарскай грамадзкасьцю, асабліва перад пралетарскімі пісьменьнікамі БССР, задачу стварэньня новай сапраўды савецкай опэры, якая паказала-б барацьбу рабочае клясы за будаўніцтва сацыялізму.

Трэба «Залаты Пеўнік» паказаць шырокаму рабочаму гледачу, трэба гэтую пастаноўку паставіць на абгаварэньне шырокіх рабочых мас. Пралетарская грамадзкасьць павінна дапамагчы студыі выявіць як дадатныя, так і адмоўныя бакі пастаноўкі «Залатога Пеўніка».

Нельга не адзначыць самаадданай работы над стварэньнем Беларускага Дзяржаўнага тэатру опэры і балету і ў прыватнасьці над стварэньнем «Залатога Пеўніка» т.т. Гіттарца—дырэктара студыі, Тэзаўроўскага, пастаноўшчыка «Залатога Пеўніка», таленавітага мастака Панфілава і ўсяго настаўніцкага складу студыі. У надзвычайна няспрыяючых умовах, у якіх знаходзілася студыя, работу над стварэньнем «Залатога Пеўніка» мы лічым геройнай.

Трэба акружыць студыю, увагай. Далейшая работа студыі не павінна выйсьці з поля ўвагі і кантролю пралетарскай грамадзкасьці. Студыя опэры і балету — будучы Дзяржаўны Беларускі тэатр опэры і балету, павінен стаць бальшавіцкай зброяй для камуністычнай прапаганды, для мабілізацыі мас у змаганьні за сацыялістычнае будаўніцтва.

Б. Бронін. Р. Іко.

Каго рыхтавалі ў школе „Дорстройвучу"?

Белгалоўтранс у 1931 годзе адкрыў у Магілеве школу «Дорстройвуч», у якой павінны былі падрыхтоўвацца дзесятнікі, дарожныя майстры і машыністы.

Аднак калі ўжо быў праведзены набор і пачаліся заняткі, аказалася, што школа рыхтуе адных дзесятнікаў. У канцы навучальнага году, калі надышоў час практычных работ, аказалася, што школа рыхтуе кваліфікаваных... цесьляроў.

Аднак, на гэтым справа яшчэ не закончваецца. Кіраўніцтва школай баючыся, каб вучні не разыйшліся, заявіла, што школа рыхтуе дзесятнікаў з укілам па брукаваньні. На гэтым пытаньні кіраўнікі школы некалькі разоў езьдзілі ў Белдартранс і пасьля апошняй паездкі выявілася: вучні на практыку едуць у якасьці цесьляроў.

Вучань.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

— 20-га чэрвеня 1931 г., а 6-й гадзіне ўвечары ў малой залі ЦК КП(б)Б Агітмасавы Аддзел склікае нараду па выніках веснавой сяўбы. На нараду павінны зьявіцца ўсе ўпаўнаважаныя ЦК, якія выяжджалі на правядзеньне пасеўнай кампаніі ў раёны.

Пам. заг. агітмасавым аддзелам ЦК КП(б)Б Эльман.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА
(Савецкая, 68)

18-га чэрвеня а 8-ай гадзіне ўвечары склікаецца сход фракцыі МенАПП.

Яўка ўсіх членаў партыі і камсамольцаў абавязкова ў парадку партыйнай дысцыпліны.

Часовае Бюро.

— 23-га чэрвеня г. г., а 12 гадзіне дня Сьмілавіцкім РК і РКК КП(б)Б склікаецца раённая нарада рабселькораў.

Павестка дня:

1. Вынікі правядзеньня веснавой сяўбы і падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі.
2. Вынікі месячніка друку і чарговыя задачы рабселькораў.

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі ўсіх цэнтральных газэт.

Нарада адбудзецца ў Сьмілавіцкім пардоме РК і РКК КП(б)Б.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Мендзяржтэатр
Бел. Дзярж. студыя опэры і балету.
СЁНЬНЯ ОПЭРА
„ЗАЛАТЫ ПЕЎНІК"
Р. КОРСАКОВА.
Білеты прадаюцца ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 гадз. і ў касе тэатру з 5 гадз. — Пачатак у 9 гадз.

Дзярж-ЦЫРК
Сёньня і штодзённа ВЯЛІКІ ЦЫРКАВЫ ПАКАЗ
Савецкі атракцыён „Сав" Электрычны ваўчок і шмат інш. нумароў
Пачат. а 8 г. 45 х. увечары
Льготныя білеты ў рабкасе

„Чырвоная Зорка"
Амэрыканская камэдыя Малодшы сын у 8 частках
у галоўнай ролі Гарольд Лёйд.
Пачатак а 7 гадз. Каса з 5 г.

Кіно-тэатр „Культура"
Нямецкі фільм Пасынкі Бэрліна
Звыш праграмы хроніка—Саюзкіно.
Пачатак а 7 гадзіне.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Замежны фільм Трагэдыя акрабата
Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
2 фільмы ў 1 сэанс
1. Чашка гарбаты—ў 5 ч. (Ігор Ільінскі)
2. Скрозь полымя—ў 5 ч. (Рычард Толмедж)
Пачатак а 2, 3.45, 7 8.45 і 10.30

БЕЛДЗЯРЖСНАБ
прыймае ад зацікаўленых установаў
заяўкі на незгараемыя шафы і сундукі
на III—IV квартал 1931 г.
Заяўкі павінны быць прадстаўлены не пазьней 15-VI г. г.
Установы і арганізацыі, не прадставіўшыя да тэрміну заявак, будуць пазбаўлены атрыманьня апошніх
Разьмер шафаў—1+1 67×63×50 см . . . 450 р.
сундукоў—№ 8 65×55×52 см . . . 200 р.
БЕЛДЗЯРЖСНАБ.

БЕЛКАНТОРА САЮЗНАСЕНАВОДУ
паведамляе, што з пераводам саўгасаў сыстэмы Саюзнасенаводу на поўны гаспадарчы разьлік, рахункі на адпраўленыя грузы ў адрасы саўгасаў і за розныя паслугі
з 1-га мая г. г. НЕАБХОДНА НАКІРАВАЦЬ непасрэдна саўгасам,
якія маюць свае кантакарэнты ў філіялах Дзяржбанку, згодна ніжэй паказанага сьпісу.
Рахункі на адпраўленыя ў адрас саўгасаў грузы і адрасаваныя на Белкантору Саюзнасенавода ДЛЯ АПЛАТЫ ПРЫМАЦЦА НЯ БУДУЦЬ.
СЬПІС КАНТАКАРЭНТНЫХ РАХУНКАЎ САЎГАСАЎ БЕЛКАНТОРЫ САЮЗНАСЕНАВОДА

№№ п. п.	НАЗВА САЎГАСАЎ	Якога раёну	Паштовы адрас	Тэлеграфны адрас	Чыгуначная станцыя	Месцазнаходжаньне філіялу Дзяржбанку	Кантакарэнты: Па зваротных сродках	Кантакарэнты: Па капітальных затрат
1	Дукора	Сьмілавіцкага	Дукора	Дукора	Рудзенск	Сьмілавічы	64-28	64-28а
2	Сьмілавічы	„	Сьмілавічы	Сьмілавічы	„	„	64-29	64-299
3	Пралетары	Церахаўскага	Церахоўка	Церахаўка	Церах ўка	Гомель	319	320
4	Слабада	Мазырскага	Слабада	Слабада	Мазыр	Мазыр	64-1151	97-2136
5	Чэчавічы	Чэчавіцкага	Чэчавічы	Чэчавічы	Друць	Чэчавічы	64 —	96
6	Канстанцінава	Капаткевіцкага	Капаткевічы	Капаткевічы	Пціч	Капаткевічы	64-401	97-105
7	Маладая Гвардыя	Чэрвеньскага	Чэрвень	Чэрвень	Градзянка	Чэрвень	64-01	97-3
8	Доктаровічы	Копыльскага	Копыль	Копыль	Слуцк	Копыль	64-15	97-63
9	Лопухі-Старыца	Грэскага	Грозава	Грозава	„	Грэск	64 —	97
10	Цімкавічы	Копыль	Цімкавічы	Цімкавічы	„	Копыль	64-14	97-149
11	Ачэса-Рудня	Ветка	Мала-Вышкаў	Мала-Вышкаў, Н.-Злынкаўск. р.	Злынка	Ветка	3	4
12	Рудня-Астравітая	Чэрвень	Чэрвень	Чэрвень	Пухавічы	Чэрвень	64 —	97 —
13	Побалава-Забалоце	Рагачоў	Побалава	Побалава	Чырвоны Бераг	Рагачоў	63	23
14	Шыпяны	Смалявічы	Смалявічы	Смалявічы	Смалявічы	Смалявічы	64-01	97-01
15	Леніна	Горацкі	Леніно	Леніно	Горкі	Горкі Бел.	64-20	97 22
16	Белкантора Саюзнасенавода	Менск	Менск	Менск	Менск	Белкантора Дзяржбанку	64-100696	97-658
17	Дзяржнасенфонд	„	„	„	„	„	67-286	—

Белкантора Саюзнасенавода

Назначаны на 18 чэрвеня
сход таварыства ГІСТОРЫКАЎ-МАРКСЫСТАЎ
)—(пераносіцца)—(
на 20 чэрвеня ў 19 гадз. у памяшканьні камузу.
Будзе заслухан даклад тав. Стальнага аб Парыскай Камуне.

БЕЛГАНДАЛЬ ПРАДАЕ ЖЫВУЮ ПТУШКУ:
1. У ларку па Ніжнім рынку, ля маста;
2. У магазыне на рагу Віленскага рынку і вул. Бухарына;
3. Штодзень сьвежую бітую птушку прадае ў магазыне № 1 па Савецкай, 65.
Белгандаль.

ЗГУБЛЕНА ДАВЕРАНАСЬЦЬ
выданая 11-X—30 г. Лесаб'яднаньнем Лесбел на імя дырэктара Тураўскага Леспрамгасу Левіна Арона Файбавіча
лічыць НЕСПРАЎДНАЙ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.
Падпісная плата: 1 месяц—90 к., 3 м-цы—2,70, 6 м-цаў—4,00, на год—8,00
Глаўлітбел № 598
Друкарня імя СТАЛІНА